Высокі пілатаж над Баранавічамі

СТАР. 3

Еўрабачанне + футбол і хакей...

СТАР. 5

Імёны «залатога перыяду» беларускага кіно

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 СНЕЖНЯ 2015 г. СУБОТА № 246 (28104) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАЛАТЫ ЎЗРОСТ КАХАННЯ

Фота Надзеі БУЖАН.

Мінскі Дом шлюбаў адзначыў свой пяцідзесяцігадовы юбілей. Каля 110 тысяч пар за паўстагоддзе пачалі адсюль сваё сямейнае жыццё. З гэтай нагоды было вырашана запрасіць на свята пару, якая распісалася тут у снежні 1965 года — 50 гадоў таму. Сямён Аляксандравіч і Алена Васільеўна КРУЧАКІ *(на фота)* паставіліся да гэтай ідэі з радасцю. Сваё залатое вяселле муж і жонка адсвяткавалі разам з дзецьмі і ўнукамі, перадаўшы «эстафету шчасця» маладым.

ЦЫТАТА ДНЯ

Усевалад ЯНЧЭЎСКІ, памочнік Прэзідэнта:

«Сетка 4G пабудавана ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Беларусі ад 13 снежня 2012 года №556. Але сетка 4G — толькі пачатак. Для нашай краіны вельмі важна і ў тэлекамунікацыях, і ў IT-сферы хутка рухацца далей. Таму што хуткасць змяненняў тэхналогій у сучасным свеце проста фантастычная».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 8°	
Віцебск	+ 6°	
Гомель	+ 6°	
Гродна	+ 8°	
Магілёў	+ 6°	
Мінск	+ 7°	

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.12.2015 г.

Долар ЗША	18370,00	▲
Еўра	19948,00	▲
Рас. руб.	257,67	▼
Укр. грыўня	780,62	▲

ГУЛЬНЯ ДЛЯ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

Аляксандр Лукашэнка і прэзідэнт Міжнароднай шахматнай федэрацыі (ФІДЭ) Кірсан Ілюмжынаў дамовіліся аб рэгулярным правядзенні ў беларускай сталіцы буйных шахматных турніраў



Фота БЕЛТА.

У прыватнасці, у наступным годзе ў Мінску будзе праведзены жаночы Гран-пры і восенню — чэмпіянат свету сярод жанчын па накаўт-сістэме, дзе 64 наймацнейшыя шахматысткі з 50 краін будуць змагацца за права быць чэмпіёнам свету. Арыенціровачна гэты турнір адбудзецца ў лістападзе 2016 года, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.

«Нам за гэты інтэлектуальны від спорту (хоць цяжка сказаць, спорт гэта або нейкае мастацтва, напэўна, і тое, і другое) не соромна, таму што ў Беларусі мы стараемся на даволі высокім узроўні падтрымліваць яго і не толькі ствараць патэнцыял, але і развіваць гэты від спорту», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем заўважыў, што калі дзеці і моладзь дамагаюцца высокіх вынікаў на міжнародных турнірах, то ў дарослых пакуль тое не атрымліваецца. «Таму гэта — наша задача», — дадаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускі бок гатовы дапамагаць ФІДЭ ў намеры ажыццяўляць нейкія мерапрыемствы ў краіне. «Вы ведаеце, што дзяржава заўсёды гатова ў гэтым плане падставіць плячо, каб мы нарэшце і сярод дарослых пачалі выдаваць добрыя вынікі па гэтым вельмі важным відзе спорту», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

У сваю чаргу Кірсан Ілюмжынаў адзначыў, што правядзенне ў Мінску буйных шахматных турніраў будзе карысным для падтрымкі і развіцця беларускіх шахматыстаў. «З аднаго боку, гэта і развіццё, і папулярызацыя шахмат сярод насельніцтва, а з іншага — дапамога прафесійных шахматыстаў, магчымасць іграць на такіх буйных турнірах і дамагацца высокіх узнагарод і званняў», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка і Кірсан Ілюмжынаў дамовіліся, што НАК Беларусі падтрымае ФІДЭ па ўключэнні шахмат у праграму зімовых Алімпійскіх гульняў. Паводле слоў прэзідэнта Міжнароднай шахматнай федэрацыі, ФІДЭ падтрымалі ўжо больш за 100 нацыянальных алімпійскіх камітэтаў. Ён таксама расказаў, што дамовіўся са старшынёй аргкамітэта зімовых Алімпійскіх гульняў, што шахматы будуць прадстаўлены ў 2018 годзе ў Паўднёвай Карэі на Алімпіядзе ў якасці культурнай, выставачнай праграмы. «Мы пакажам кіраўнікам нацыянальных алімпійскіх камітэтаў, што шахматы павінны быць уключаны ў зімовую алімпійскую праграму», — сказаў ён.

СТАР. 2

БАГАЦЦЕ ЗЯМЛІ

На нарадзе аб стане і перспектывах развіцця сыравіннай базы Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на праблеме імпарту карысных выкапняў, якіх у нас з лішкам

Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, зразумела, калі Беларусь траціць вялізныя сродкі на набыццё сыравіны, якой недастаткова. «Толькі на вуглевадароды расходуем больш за $11 млрд штогод. Але гэта імпарт, дзякуючы якому мы забяспечваем стабільную работу нашай энергетычнай сістэмы і іншых важных эканамічных галін. Аднак не зразумелы імпарт таго, чаго ў нас хапае з лішкам, напрыклад, шчэбеню, гравію, пяску, гліны, мелу, гіпсу і іншых пазіцый», — сказаў Прэзідэнт.

«Больш пільнай увагі патрабуе і праблема рацыянальнага выкарыстання ўласных карысных выкапняў, нарошчвання экспартнага патэнцыялу, тавараў і паслуг у гэтай сферы», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Як паведаміў карэспандэнт БЕЛТА, падчас нарады абмяркоўваліся пытанні зніжэння залежнасці эканомікі краіны ад імпарту сыравіны. Паводле слоў Прэзідэнта, гэта датычыцца не толькі энерганосьбітаў, але і іншых рэсурсаў. Найперш Аляксандр Лукашэнка цікавіўся, як наладзіць на належным узроўні імпартазамяшчэнне існуючых у Беларусі рэсурсаў.

На нарадзе ішла размова і аб тым, што робіць урад для нарошчвання экспартнага патэнцыялу Беларусі, у прыватнасці для павелічэння або арганізацыі паставак за мяжу тых карысных выкапняў, па якіх у краіне ёсць значныя рэзервы. Прэзідэнт таксама палічыў неабходным абмеркаваць пытанне аптымізацыі структуры экспарту, магчымасці паставак за мяжу не проста сыравіны, а гатовай прадукцыі, вырабленай з яе. На думку Аляксандра Лукашэнкі, пры спадзе сусветных цэн на нафту трэба думаць аб іншай галіновай структуры, якая будзе забяспечваць устойлівасць эканомікі Беларусі.

СТАР. 2

ЗАКОНЫ — ДЛЯ ЧАЛАВЕКА

Выступленне старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Мясніковіча М.У. на закрыцці дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання (18 снежня 2015 года)

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Сёння завяршае сваю работу дзясятая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання. Мы з вамі працавалі ў дастаткова няпросты, але вельмі важны ў палітычным і эканамічным плане год. Вынікі выбарчай прэзідэнцкай кампаніі сведчаць аб падтрымцы палітыкі, якая праводзіцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкам. Разам з тым гэты давер накладае на нас яшчэ большую адказнасць і патрабуе новых, больш дасканалых падыходаў да вырашэння значных дзяржаўных задач.

З 1 студзеня 2016 года пачынаецца новы пяцігадовы перыяд. Для паспяховага развіцця краіны патрэбны новыя праекты, новыя ідэі, новыя кіраўніцкія рашэнні, новыя законы. Мы, парламентарыі, не павінны чакаць даручэнняў. Нам варта праяўляць ініцыятыву, працаваць актыўна. Прамая наша задача — канадаваць забеспячэнне развіцця краіны ў сучасных умовах. Пры гэтым будзем строга кіравацца палітычнымі ўстаноўкамі кіраўніка дзяржавы, садзейнічаць стварэнню роўных і камфортных умоў працы для ўсіх суб'ектаў гаспадарання і інвестараў, павышэнню ўзроўню адкрытасці эканомікі, гарманізацыі прававых умоў знешняга гандлю.

СТАР. 2

АКЦЭНТ НА ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЗБАЛАНСАВАНАГА РАЗВІЦЦЯ ЭКАНОМІКІ І САЦЫЯЛЬНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

Выступленне старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанкі У.П. на закрыцці восьмай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання (18 снежня 2015 года)

Паважаныя дэпутаты!

Паважаныя запрошаныя і журналісты!

Восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання завяршае сваю работу.

Яе вынікам стала прыняцце важкага пакета запатрабаваных грамадствам і дзяржавай законапраектаў, ключавое месца сярод якіх, безумоўна, займае Закон аб рэспубліканскім бюджэце.

Падрыхтоўка галоўнага фінансавага дакумента праходзіла вельмі няпроста. І распрацоўшчыкі, і дэпутаты

добра разумелі, што задача ўздыму нацыянальнай эканомікі ва ўмовах сусветнага спаду патрабуе дастаткова жорсткіх абмежавальных мер. Разам з тым менавіта сёння як ніколі важна забяспечыць сацыяльныя гарантыі. У гэтым залог грамадскай стабільнасці, а значыць, і ўстойлівага развіцця краіны. Бо стратэгічны рэсурс Беларусі — гэта чалавечы патэнцыял. Менавіта з такіх пазіцый дэпутаты падыходзілі да разгляду бюджэту і спадарожных яму дакументаў.

У выніку кансультацый, якія прайшлі, большасць прапаноў парламентарыяў была ўлічана.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ААН прыняла рэзалюцыю аб барацьбе з гераізацыяй нацызму

Генасамблея ААН прыняла рэзалюцыю аб барацьбе з гераізацыяй нацызму. Сааўтарам дакумента выступіла Беларусь. Рэзалюцыя была прынята большасцю галасоў, яна атрымала падтрымку 133 краін, 49 — устрымаліся, 4 — выступілі супраць (ЗША, Канада, Украіна і Палау). Рэзалюцыя сярод іншага заклікае краіны свету прыняць меры «па супрацьдзеянні любому ўшанаванню нацысцкай арганізацыі СС і ўсіх яе складовых частак, уключаючы Вафен СС». Адзначаецца заклапочанасць «узвядзеннем помнікаў і мемарыялаў і правядзеннем публічных дэманстрацый з мэтай праслаўлення нацысцкага мінулага, нацысцкага руху і неанацызму».

У Даніі хочуць канфіскоўваць каштоўнасці ў бежанцаў

Улады Даніі, якія сутыкнуліся з небывалым наплывам бежанцаў нароўні з астатняй Еўропай, плануюць зрабіць больш жорсткімі законы, якія тычацца правілаў прадастаўлення прытулку вымушаным мігрантам. У прыватнасці, яны хочуць дазволіць канфіскацыю ў іх грашовых сродкаў і каштоўнасцей у кошт аплаты іх знаходжання ў краіне. Адпаведны законапраект 10 снежня быў унесены ў парламент Даніі. Чакаецца, што ён будзе разгледжаны ў студзені 2016 года. Гэтая навіна выклікала хвалю абурэння сярод інтэрнэт-карыстальнікаў па ўсім свеце. Некаторыя каментарыі назвалі падобны закон «абуральным». Іншыя і зусім параўналі апісаны падыход да бежанцаў з тымі мерамі, якія выкарыстоўваліся ў нацысцкай Германіі. The Washington Post тлумачыць, што прапанаваны ў Даніі законапраект дасць магчымасць абшукваць вопратку і багаж бежанцаў, якія жадаюць атрымаць прытулак у краіне, з мэтай пошуку грашовых сродкаў і каштоўных рэчаў, што маглі б пакрыць выдаткі на іх утрыманне. Паліцыі дазволяць канфіскоўваць у прыезджых каштоўнасці і грашовыя сумы, якія тая палічыць занадта значнымі.

Папа Рымскі прызнаў здзяйсненне цуду маці Тэрэзай

Папа Рымскі Францыск ліквідаваў апошнюю перашкоду для кананізацыі заснавальніцы жаночай манаскай кангрэгацыі «Сёстры Місіянеркі Любові», лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру, каталіцкай манашкі маці Тэрэзы Калькуцкай, пра што паведамляюць інфармагенцтвы. Вечарам 17 снежня Папа Рымскі прызнаў здзяйсненне цуду знакамітай каталіцкай манашкай, блажэннай маці Тэрэзай Калькуцкай. Маецца на ўвазе факт вылячэння маці Тэрэзай 35-гадовага бразільца, у якога была невылечная паталогія галаўнога мозга. Кананізацыю маці Тэрэзы плануецца правесці 4 верасня 2016 года, напярэдадні 19-й гадавіны яе смерці.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У Латвіі забароняць курыць у машыне

Урад Латвіі ўхваліў «Закон аб абароце тытунёвай прадукцыі». Як паведамляюць інфармагенцтвы, адным з пунктаў дакумента з'яўляецца забарона на курэнне ў аўтамабілі. «Гэта наша нацыянальная

ўстаноўка. Адна з прычын — гэта бяспека, бо цыгарэта адцягвае ўвагу. Другая — пасіўнае курэнне, паколькі машына — закрытая прастора», — заявіла прадстаўніца Міністэрства аховы здароўя краіны. Супраць забароны на курэнне ў машынах выступіла бюро омбудсмена Латвіі. Па словах яго прадстаўніка Руты Сіліні, такія папраўкі лёгка можна будзе аспрэчыць у Канстытуцыйным судзе. Тым часам у Міністэрстве аховы здароўя Латвіі выступаюць за яшчэ большае ўзмацненне жорсткасці антытытунёвых нормаў. Паводле слоў міністра аховы здароўя Гунціс Бялевіч, латышам плануюць забараніць курэнне на ўсіх працоўных месцах і ва ўсіх гасцініцах.

КОРАТКА

У Беларусі ўстаноўлены новы памер базавай велічыні — з 1 студзеня 2016 года ён складзе Br210 тыс. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў № 1059 ад 18 снежня 2015 года.

Камітэт дзяржаўнай бяспекі Беларусі сабраў інфармацыю аб 58 грамадзянах Беларусі, якія прымаюць удзел у баявых дзеяннях на тэрыторыі Украіны з абодвух бакоў.

Усе аб'екты гандлю ў Мінску (у тым ліку сезонныя гандлёвыя палаткі і невялікія магазіны) абавязаны заключыць дагаворы на вываз смецця.

На абслугоўванне дзяржаўнага доўгу ў 2016 годзе будзе накіравана больш як Br20 трлн.

У гэтыя выхадныя Дзяржаўтаінспекцыя Беларусі правядзе маштабныя рэйды па выяўленні аўтамабілістаў-бяспраўнікаў. Вызначаць у патоку машыны, уласнікі якіх не маюць вадзіцельскага пасведчання, інспектары ДАІ будуць з дапамогай мабільных праграмна-апаратных комплексаў ідэнтыфікацыі рэгістрацыйных знакаў транспартных сродкаў «Аўтаўраган».

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

АБ'ЕКТЫЎНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ І КАНКРЭТНЫЯ ФАКТЫ

Прэс-сакратар аддзела па працы са зваротамі грамадзян і сувязях з грамадскасцю Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Алена КАСЦЮКОВА:

— Упершыню я трымала «Звязду» ў руках яшчэ ў школьныя гады. Ужо тады я дакладна ведала, што гэта сур'ёзнае выданне, калі журналіст адказвае за кожнае сваё слова. За мінулыя гады на газетным рынку многае змянілася. А вось «Звязда» і цяпер застаецца вернай свайму духу, свайму чытачу, які ёй давярае. Таму ваша выданне не дазваляе сабе вольнай трактоўкі падзей, а прапануе заўсёды толькі аб'ектыўную інфармацыю і абгрунтаваныя факты.

А ўвогуле, «Звязда» — адно з найстарэйшых беларускіх выданняў, газета з гераічным лёсам, якая друкавалася ў тым ліку падчас акупацыі. Разам з тым, нават у «сталым узросце» вы працягваеце трымаць руку на пульсе самых актуальных праблем у грамадстве. Мне прыемна, што карэспандэнты рэдакцыі не ганяюцца за нейкімі «жоўтымі» навінамі, а прытрымліваюцца педантычнай дакладнасці, якая крочыць побач з аператыўнасцю. На старонках выдання асвятляюцца многія тэмы, у тым ліку пытанні аб нерухомай маёмасці, якія закранаюць практычна ўсіх жыхароў нашай краіны. Матэрыялы, якія размяшчаюцца ў газеце, заўсёды адрозніваюцца глыбінёй і ўсебаковасцю. Яны цікавыя і органам дзяржкіравання, і простым людзям.

Запісаў Сяргей КУРКАЧ.

kurkach@zviazda.by

ГУЛЬНЯ ДЛЯ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На сустрэчы размова ішла таксама аб будаўніцтве новага адміністрацыйнага комплексу ў Мінску, у якім будуць размяшчацца філіял ФІДЭ і федэрацыя шахмат Беларусі.

Кірсан Ілюмжынаў падзякаваў беларускаму боку і асабіста Прэзідэнту за арганізацыю ў Мінску чэмпіянату Еўропы па хуткіх шахматах і бліцы, які праходзіць гэтымі днямі. У Мінск прыехалі каля тысячы ігракоў з 31 краіны. Сярод іх — многія вядучыя шахматысты, якія ўваходзяць у першую сотню сусветнага рэйтынга, удзельнікі і фіналісты чэмпіянатаў свету і Еўропы, кубкаў свету, матчаў і турніраў прэтэндэнтаў на сусветную шахматную карону.

Прэзідэнт Беларусі і прэзідэнт Міжнароднай шахматнай федэрацыі дамовіліся, што ў 2016 годзе ў Беларусі пачнуць пілотна ўкараняць праграму «Шахматы ў школах». Першапачаткова праграму будуць праходзіць на факультатыўнай аснове як у мінскіх школах, так і ў рэгіёнах. Міжнародная шахматная федэрацыя са свайго боку дапаможа ў падрыхтоўцы трэнераў, правядзенні семінараў і майстар-класаў, а таксама з падручнікамі.

Кірсан Ілюмжынаў падкрэсліў, што мае намер у наступным годзе асабіста наведаць адзін з першых урокаў, а таксама правесці майстар-клас для выкладчыкаў і дырэктараў школ.

БАГАЦЦЕ ЗЯМЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Акрамя таго, на нарадзе былі разгледжаны перспектывы актывізацыі геалагаразведачных работ, асваення новых радовішчаў карысных выкапняў і ўключэння іх у гаспадарчы абарот. Удзельнікі абмеркавалі, як вырашаецца задача экспарту паслуг па вывучэнні нетраў за мяжой, што робіцца для прыцягнення інвестараў у здабычы прыродных рэсурсаў, для ўкаранення інавацыйных тэхналогій з мэтай комплекснага і найбольш выгаднага выкарыстання гэтых рэсурсаў.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што тэма гэтай нарады важная з пункту гледжання не толькі эканомікі, але і палітыкі. «Гэта не проста эканоміка, але і палітыка, якая ўпіраецца ў незалежнасць нашай дзяржавы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Карысныя выкапні — гэта дадзеныя нам прыродай багацці, якімі мы павінны распараджацца беражліва і дбайна на карысць і сучаснага пакалення беларусаў, і будучых», — прадоўжыў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што нават пры сённяшняй няўстойлівасці сыравінных рынкаў многія краіны дэманструюць стабільнае развіццё, якое забяспечваецца за кошт рацыянальнага выкарыстання нацыянальных багаццяў, укаранення высокаэфектыўных тэхналогій іх здабычы і перапрацоўкі. Прэзідэнт лічыць, што для Беларусі асабліва востра стаіць двухадзіная задача: з аднаго боку, забеспячэнне максімальнай эфектыўнасці выкарыстання ўласных і імпартных рэсурсаў, з іншага — пашырэнне маштабаў і наменклатуры здабычы выкапняў з мэтай іх імпартазамяшчэння і скарачэння адтоку валюты на іх закупку.

Кіраўнік дзяржавы даручыў у поўным аб'ёме вывучыць перспектыўныя рэгіёны краіны на прадмет выяўлення новых радовішчаў нафты. Размова ідзе аб Аршанскай (Віцебская вобласць) і Падляска-Брэсцкай упадзінах (Брэсцкая і Гродзенская вобласці). Гэтыя тэрыторыі пакуль недастаткова вывучаны. Да іх цяпер павінна быць прыкавана ўвага спецыялістаў.

На нарадзе таксама абмяркоўвалася рэалізацыя праектаў па павелічэнні выкарыстання торфу на цэментных заводах замест імпартуемага каменнага вугалю. Чакаецца, што на працягу 2016-2017 гадоў на прадпрыемствах будзе выкарыстоўвацца каля 420 тысяч тон тарфяных брыкетаў. Гадавая эканомія, паводле падлікаў урада, складзе $15-20 млн.

Кіраўніку дзяржавы было даложана аб праграме вывучэння нетраў і развіцця мінеральна-сыравіннай базы Беларусі на 2016-2020 гады. Дакумент прадугледжвае пошук радовішчаў ужо разведаных і новых відаў карысных выкапняў. Запланаваны таксама рэгіянальныя работы, якія будуць праводзіцца на малавывучаных тэрыторыях, вялікіх глыбінях.

Цяпер у Беларусі выяўлена 82 радовішчы нафты, 75 перададзены на баланс «Беларуснафты» для распрацоўкі, на сямі радовішчах вядуцца работы ў розных стадыях разведкі і падрыхтоўкі да асваення. Усе выяўленыя радовішчы нафты адносяцца да Прыпяцкага прагіну (Гомельская і Магілёўская вобласці). Штогод Беларусь здабывае 1,64 млн т нафты. У краіне ёсць больш за 9 тысяч тарфяных радовішчаў з геалагічнымі запасамі каля 4 млрд тон, штогод выпускаецца 1 млн 240 тысяч тон торфабрыкету. Усяго ў нетрах Беларусі знойдзена больш за 10 тысяч радовішчаў розных відаў карысных выкапняў.

АДБУДЗЕЦЦА РАБОЧЫ ВІЗІТ ПРЭЗІДЭНТА Ў МАСКВУ

Аляксандр Лукашэнка 21 снежня зробіць рабочы візіт у Маскву. Прэзідэнт Беларусі прыме ўдзел у пасяджэннях Савета калектыўнай бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) і Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

У цэнтры ўвагі саміту АДКБ будуць знаходзіцца актуальныя праблемы міжнароднай бяспекі і магчымыя крокі Арганізацыі па іх вырашэнні. У ходзе сустрэчы на вышэйшым узроўні ў фармаце ЕАЭС яе ўдзельнікі, у прыватнасці, разгледзяць пытанні функцыянавання Еўразійскай эканамічнай камісіі, супрацоўніцтва ў галіне лібералізацыі аўтамабільных перавозак, узаемадзеяння ЕАЭС з іншымі міжнароднымі арганізацыямі і міждзяржаўнымі аб'яднаннямі.

СВЕДЧАННЕ ДАВЕРУ

Дэпутаты далі згоду Прэзідэнту на прызначэнне Андрэя Кабякова прэм'ер-міністрам

«За» прагаласавалі 105 дэпутатаў. Перад тым, як было прынята рашэнне, Андрэй Кабякоў выступіў з разгорнутым дакладам аб сучасным стане эканомікі і перспектывах яе развіцця і адказаў на пытанні парламентарыяў.

Людміла МІХАЛЬКОВА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве, у размове з журналістамі пацвердзіла: парламентарыі давяраюць нядаўна прызначанаму ўраду і ў прыватнасці Андрэю Кабякову.

— Нам вельмі прыемна працаваць з дзеючым урадам, супрацоўнічаем вельмі цесна, — адзначыла дэпутат. — Я, відаць, выказваю меркаванні ўсіх дэпутатаў: гэта вельмі добрыя прызначэнні.

Сяргей ДУДКІН, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі, упэўнены, што трэба працаваць усім: і прадстаўнікам урада, і звычайным грамадзянам.

— З дзеючым прэм'ер-міністрам, кабінетам міністраў мы працуем каля года, і заўсёды дасягалі згоды.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

Тры пакаленні чэкістаў

Яны адлюстраваны на памятным знаку ў гонар супрацоўнікаў органаў дзяржбяспекі, які адкрыўся ў Магілёве напярэдадні прафесійнага свята гэтых мужных людзей.

Фота БЕЛТА.

Толькі на тэрыторыі Магілёўскай вобласці з ліку чэкістаў нарадзіўся, змагаўся і праходзіў службу 21 Герой Савецкага Саюза. Сярод іх Леў Маневіч, Кірыл Арлоўскі, Анатоль Шастакоў, Вера Харужая і іншыя героі, якія сталі прыкладамі для сваіх паслядоўнікаў.

На гранітнай стэле памятнага знака тры твары, тры збіральныя вобразы вядомых і невядомых салдат нябачнага фронту, якія склалі галовы, выконваючы свой грамадзянскі і службовы доўг.

— Гэты знак сімвалізуе непарыўную сувязь часоў, вернасць найлепшым традыцыям, гатоўнасць да самаахвяравання ў імя народа і Айчыны, — адзначыў **старшыня КДБ Рэспублікі Беларусь Валерый ВАКУЛЬЧЫК**, які прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця помніка.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

САЦЫЯЛЬНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ЗАХАВАЕЦЦА

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў разгледзелі бюджэтны пакет

У бюджэце краіны па-ранейшаму асноўная ўвага надаецца выкананню сацыяльных абавязкаў дзяржавы перад людзьмі. У прыярытэце — сферы адукацыі і аховы здароўя. Прадугледжана фарміраванне «сямейнага капіталу» — у наступным годзе на яго выдзелена 2 трыльёны рублёў. Значную частку бюджэту складуць выдаткі на аплату працы, а таксама на пенсіі, стыпендыі, дапамогі, іншыя выплаты, сродкі на выкананне дзяржаўных сацыяльных стандартаў.

НАДЫДЗЕ ЧАС — НУЛІ «АДРЭЖУЦЬ»

Забеспячэнне росту і дыверсіфікацыі экспарту, стварэнне новых працоўных месцаў, павышэнне эфектыўнасці выкарыстання дзяржаўнай уласнасці — такімі будуць ключавыя мэты развіцця нашай краіны ў наступным годзе. Згодна з праектам рэспубліканскага бюджэту на 2016 год прадугледжваюцца даходы ў суме звыш 180 трыльёнаў 590 мільярдаў рублёў. Асноўнымі крыніцамі падатковых даходаў будуць падатак на дадатковую вартасць, акцызы, падатковыя даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці. Выдаткі запланаваны ў суме 163 трыльёнаў 417 мільярдаў рублёў.

Міністр фінансаў Уладзімір АМАРЫН паведаміў, што для таго, каб абмежаваць рост знешняга дзяржаўнага доўгу, рэспубліканскі бюджэт зацвярджаецца з перавышэннем даходаў над выдаткамі — прафіцытам, які пойдзе на выплату даўгоў.

Акрамя прыярытэтных выдаткаў на адукацыю, ахову здароўя і бяспеку дзяржавы, бюджэтныя сродкі будуць таксама накіроўвацца на падтрымку рэальнага сектара эканомікі, у тым ліку экспарту, захаванне даўгавых абавязкаў на бяспечным узроўні.

Міністр запэўніў, што дэнамінацыя беларускага рубля адыграе выключна тэхнічную ролю: калі надыдзе час, у адпаведных бюджэтных дакументах проста «адрэжуць» нулі. Курс долара прагназуецца на ўзроўні прыкладна 18 700 рублёў.

ПЕНСІІ БУДУЦЬ ПАВЫШАЦЦА

У бюджэце на наступны год закладзена цана за бараль нафты ў 50 долараў. Гэты разлік быў зроблены з арыенцірам на расійскіх калег. Аднак зараз суседзі разглядаюць магчымасць паніжэння гэтага паказчыка да 40 долараў.

— Мы таксама разглядаем такі варыянт, і ў нас ёсць для гэтага механізмы, — адзначыў міністр фінансаў. Ён нагадаў, што падобная карэкціроўка рабілася і ў дачыненні да бюджэту на 2015 год.

Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах, паведаміла, што ў бюджэтнай палітыцы адбудзецца пераход на сярэднетэрміновае, а менавіта на тры гады замест пяці.

— Гэта вельмі важна, паколькі дазволіць нам павысіць эфектыўнасць розных галін эканомікі, — упэўнена парламентарый.

— Натуральна, зараз кожны чалавек думае, якая падтрымка будзе яму аказана і як ён будзе абаронены ў 2016 годзе, — адзначыла Людміла Дабрыніна. — Калі казаць пра бюджэтную сферу, то сёння выдаткі на заработную плату прадугледжаны з ростам 13%. Закладзены ўзровень інфляцыі — 12%. Гэта таксама пэўная сацыяльная абарона: будзе абаронены сямейны бюджэт работнікаў менавіта бюджэтнай сферы.

Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны, паведаміла, што пенсіі ў наступным годзе будуць павышацца разам са штоквартальнымі пераглядамі бюджэтаў пражытачнага мінімуму.

— Паступленні ў пазабюджэтны Фонд сацыяльнай абароны залежаць у першую чаргу ад узроўню заработных плат, паколькі ідуць за кошт абавязковых страхавых узносаў, — нагадала Марыяна Шчоткіна. — Мы запланавалі, што ў нас будуць паступленні, даходы нашага фонду ў памеры 123,4 трыльёна рублёў. Расходы складуць 121,3 трыльёна. Прафіцыт, які прадугледжаны ў памеры 2,1 трыльёна — гэта, насамрэч, прафесійнае пенсійнае страхаванне, абавязковыя накапленні для тых людзей, якія працуюць у шкодных і небяспечных умовах. Гэтыя грошы знаходзяцца на індывідуальных рахунках пад стаўкай рэфінансавання 2%, і іх нельга чапаць ні ў якім разе.

НАТАРЫЯТ ЗАПРАЦУЕ ПА-НОВАМУ

На ўчарашняй сесіі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, акрамя бюджэтнага пакета, прынялі ў другім чытанні праект закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях натарыяльнай дзейнасці».

Наталля ГУЙВІК, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве, паведаміла карэспандэнту «Звязды», што гэты законапраект улічвае ўсе асноўныя ідэі праведзенай у краіне рэформы натарыята, а таксама ўдакладняе некаторыя нормы дзеючага закона з улікам практыкі яго прымянення.

Нагадаем, натарыяльная сістэма краіны з 1 студзеня мінулага года стала самаўпраўляемай і самафінансуемай.

— У законапраекце больш шырока вызначаны задачы натарыята, паколькі яго дзейнасць накіравана не толькі на забеспячэнне абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян, у тым ліку і індывідуальных прадпрымальнікаў, юрыдычных асоб, але і прадугледжвае аказанне гэтым грамадзянам на прафесійнай аснове юрыдычнай дапамогі, — звярнула ўвагу Наталля Гуйвік. — Уводзіцца таксама паняцце «натарыяльнай тайны», якая ўключае ў сябе не толькі натарыяльнае дзеянне, але і звесткі, якія сталі вядомы натарыусу пры кансультаванні грамадзян і юрыдычных асоб.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

КІТАЙСКІ І БЕЛАРУСКІ ЦЭНТРЫ КУЛЬТУРЫ

з'явяцца адпаведна ў Мінску і Пекіне

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі закрыў дзясятую сесію. Падчас апошняга пасяджэння было разгледжана дваццаць пяць пытанняў. Сенатары ўхвалілі законапраекты, якія датычацца прамысловай бяспекі, мясцовага кіравання і самакіравання, развіцця прадпрымальніцтва, узаемадзеяння з іншымі дзяржавамі і бюджэтны пакет.

Адно з новаўвядзенняў праекта закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» — правядзенне рэгіянальных сходаў дэпутатаў. У гэтым годзе яны ўжо былі апрабаваны ў жніўні і верасні. У такога кшталту мерапрыемствах бяруць удзел сенатары, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, абласнога Савета. «Рэгіянальныя сходы кансалідуюць дэпутацкі корпус і паляпшаюць працу з выбаршчыкамі», — лічыць **Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.**

Згодна з яшчэ адным ухваленым верхняй палатай законапраектам, у Пекіне будзе створаны культурны цэнтр Рэспублікі Беларусь, а ў Мінску — Кітайскай Народнай Рэспублікі. На іх базе плануецца ладзіць культурныя і адукацыйныя мерапрыемствы, у тым ліку звязаныя з распаўсюджаннем моў, адкрыюцца бібліятэкі. Фінансаванне адбываецца тым бокам, які стварае цэнтр. Гэтыя ўстановы не маюць права займацца камерцыйнай дзейнасцю, але змогуць прадаваць рэкламную прадукцыю ці квіткі на мерапрыемствы, якія праводзяцца на платнай аснове.

— Па ўзгадненні з кітайскім бокам ужо вызначана, што культурны цэнтр Беларусі будзе базіравацца на тэрыторыі пасольства нашай краіны ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы,— кажа **Ірына ДРЫГА, першы намеснік міністра культуры Беларусі.** — Будаўніцтва асобнага цэнтра не плануецца. Адпаведна грашовых выдаткаў на гэта не спатрэбіцца. Кітайскі бок жадае мець асобны будынак. Мы аказваем дапамогу ў падборы ўчастка зямлі ці гатовага будынка.

Таксама члены Савета Рэспублікі прагаласавалі за законапраекты аб працоўнай міграцыі, дзяржаўна-прыватным партнёрстве, прававой ахове таварных знакаў і знакаў абслугоўвання.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ЗАКОНЫ — ДЛЯ ЧАЛАВЕКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У сацыяльнай сферы адно з важных месцаў па-ранейшаму будзе адведзена падтрымцы моладзі і сацыяльна неабароненых пластоў насельніцтва.

У знешняй палітыцы, рэалізуючы прынцып добрасуседства і шматвектарнасці, трэба больш актыўна працаваць над умацаваннем ЕАЭС і Саюзнай дзяржавы.

Па гэтых і іншых кірунках Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у выказначаным парадку будзе падтрымліваць законапраекты, што ўносяцца, і генераваць уласныя ідэі для забеспячэння эфектыўнага развіцця беларускай дзяржавы.

Арганізуючым дакументам для гэтага з'яўляюцца Асноўныя кірункі дзейнасці Савета Рэспублікі па забеспячэнні ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця і нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. На мінулым пасяджэнні Савет Рэспублікі даручыў Прэзідыуму іх зацвердзіць. Ваша даручэнне выканана. Арганізацыя выканання ўскладаецца на Анатоля Максімавіча Русецкага, кантроль пакідаю за сабой.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Што датычыцца вынікаў нашай з вамі працы падчас дзясятай сесіі, адзначу асноўныя яе вынікі.

Праведзена 5 пасяджэнняў Савета Рэспублікі, прыняты да ведама 4 дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прыняты 64 пастановы, ухвалены 48 законапраектаў, у тым ліку 24 аб выказванні згоды Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе міжнародных дагавораў.

Вялікі блок законапраектаў прыняты з мэтай забеспячэння росту эканамічнага патэнцыялу Беларусі. Закон «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве» накіраваны на развіццё прадпрымальніцкай ініцыятывы, паляпшэнне дзелавога асяроддзя, прыцягненне інвестыцый.

Закон «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва» ўстанаўлівае парадак дзейнасці мікрафінансавых арганізацый.

Па ініцыятыве Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у законе «Аб унясенні дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» замацаваны новыя формы работы дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Ратыфікаваны міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь з Расіяй, Кітаем, Сірыяй, Грузіяй, Індыяй, Пакістанам, Польшчай, Тайландам па шырокім коле пытанняў. Дагавор аб сяброўстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай заканадаўча замацоўвае прынцыпы ўзаемнага даверу і стратэгічнага ўзаемадзеяння, рэгулюе пытанні ўдзелу Беларусі ў стварэнні і развіцці Эканамічнага пояса Шаўковага шляху. Прыняты рашэнні па забеспячэнні роўных правоў грамадзян на свабоду перамяшчэння і выбар месца жыхарства ў Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі (спрошчана працэдура атрымання дазволу на пастаяннае пражыванне).

Атрымала далейшае развіццё ініцыятыва Савета Рэспублікі па правядзенні прававога маніторынгу, які дазваляе больш поўна рэалізаваць патэнцыял Савета Рэспублікі і спрыяе павышэнню якасці законаў, што прымаюцца. Па яго выніках адпаведныя прапановы накіраваны ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Прапанаваныя карэкціроўкі нормаў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі» будуць спрыяць удасканаленню маладзёжнага самакіравання і працы маладзёжных парламентаў, а Закона «Аб трацейскіх судах» — усталяванню больш дакладнай каардынацыі ўзаемадзеяння паміж судамі агульнай юрысдыкцыі і пастаянна дзеючымі трацейскімі судамі.

Паважаныя калегі!

Намі прыняты рашэнні, згодна з якімі члены Савета Рэспублікі абавязаны прымаць актыўны ўдзел у дзейнасці створаных пры мясцовых Саветах дэпутатаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў маніторынгавых груп. Старшыні абласных і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў павінны забяспечыць арганізацыю і каардынацыю гэтай работы. Пры гэтым асаблівую ўвагу варта надаваць пытанням занятасці, эксперту, развіццю эканомікі рэгіёна. Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні (Святлана Міхайлаўна Герасімовіч) забяспечыць кантроль за правядзеннем гэтай работы на месцах і штоквартальна дакладваць Прэзідыуму Савета Рэспублікі.

У рабоце на месцах пачала пераважаць канкрэтыка. Але фармалізму ў дзейнасці амаль дваццацітысячнага корпуса мясцовых Саветаў дэпутатаў яшчэ шмат. З улікам нормаў артыкула 98 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Савет Рэспублікі будзе патрабаваць ад мясцовых Саветаў дэпутатаў належных вынікаў працы. Для, як кажуць, свабоднага плавання месца няма. Не той час. Уся дэпутацкая вертыкаль павінна адказна ставіцца да выканання задач, якія стаяць перад краінай. Кожны мясцовы Савет дэпутатаў павінен несці адказнасць за становішча спраў у сваім рэгіёне. Мы, члены Савета Рэспублікі, дэпутаты ўсіх узроўняў, — сувязнае звяно паміж уладай і народам. Нам трэба ўмець чуць людзей і прымаць актуальныя рашэнні.

Упэўнены: выбаршчыкі восенню 2016 года падтрымаюць тых кандыдатаў у Парламент, якія працуюць актыўна і вынікова, а не тых, хто займаецца дэмагогіяй і палітыканствам.

Паважаныя калегі!

Нам трэба больш увагі надаваць уніфікацыі і гарманізацыі заканадаўства краін — партнёраў па Саюзнай дзяржаве і Еўразійскім эканамічным саюзе.

Саветам Рэспублікі ўжо ўнесены пэўныя прапановы па пашырэнні праекта плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2016 год. Але гэта толькі пачатак.

Галоўная мэта — гэта стварэнне агульнага рынку без выключэнняў і абмежаванняў. Ад гэтага наўпрост залежыць эфектыўнасць нацыянальнай эканомікі. Арганізацыя гэтай важнай працы ўскладаецца на пастаянныя камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы і па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, адпаведна на Уладзіміра Лявонавіча Сянько і Лілію Францаўну Мароз.

У ЕАЭС адсутнічае парламенцкае вымярэнне. Лічу, што многія сёння ўсведамляюць, што яно ўсё ж неабходна. Не дзеля сустрэч і дыскусій. Трэба збліжаць заканадаўства дзяржаў ЕАЭС. І парламенцкія намаганні будуць зусім не лішнімі. Таму нашы актыўныя дзеянні, у тым ліку ў рамках Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, ініцыятыўная работа па выбудоўванні ўзаемавыгадных адносін, забеспячэнні роўных умоў гаспадарання і добрасумленнай канкурэнцыі, стварэнні прававой базы сфарміруюць дадатковыя крыніцы і фактары росту як для ЕАЭС, так і Рэспублікі Беларусь у прыватнасці. Трэба дзейнічаць, а не чакаць. Прэзідыум Савета Рэспублікі прыняў неабходныя рашэнні, і пачалася падрыхтоўка пасяджэння навукова-кансультацыйнага савета з парадкам дня «Аб праблемах развіцця інтэграцыйных працэсаў у рамках ЕАЭС і іх заканадаўчым рэгуляванні». Да гутаркі будуць запрошаны ўсе зацікаўленыя, у тым ліку высокія чыноўнікі Еўразійскай эканамічнай камісіі.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

З мэтай выканання ўстановак кіраўніка дзяржавы Савет Рэспублікі стаў актыўна выкарыстоўваць вопыт парламенцкай дыпламатыі ў рабоце па нарошчванні і дыверсіфікацыі беларускага экспарту. Пакуль рана казаць пра прадукцыйнасць гэтай дзейнасці, але мы, напрыклад, узялі на сябе арганізацыю вырашэння пытанняў будаўніцтва чатырох фармацэўтычных заводаў у Рэспубліцы Беларусь з індыйскімі кампаніямі, забяспечваем стварэнне шэрагам беларускіх машынабудаўнічых прадпрыемстваў гандлёва-сэрвісных цэнтраў у Індыі, Туркменістане, рэалізацыю некаторых іншых праектаў.

У міжсесійны перыяд нас чакае напружаная міжнародная праграма. Найперш гэта падрыхтоўка трэцяга Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбудзецца ў Мінску. Плануецца нарасціць дынаміку двухбаковых кантактаў — цяпер прапрацоўваюцца візіт у Рэспубліку Беларусь парламенцкай дэлегацыі Пакістана і візіты беларускіх парламентарыяў у Індыю, Іран і Аман. Будзе працягнута праца ў Парламенцкім Сходзе Саюза Беларусі і Расіі, Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы і іншых міжнародных арганізацыях, ажыццёўлена падрыхтоўка да ўдзелу парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь у 134-й Асамблеі Міжпарламенцкага Саюза.

Паважаныя калегі!

2016 год для нас асаблівы. У гэтым годзе пройдуць чарговыя парламенцкія выбары. Усе мы будзем трымаць справаздачу перад выбаршчыкамі аб праведзенай працы. Галоўная задача ўсіх уладных структур — гэта павышэнне жыццёвага ўзроўню нашых грамадзян, забеспячэнне суверэнітэту і нацыянальнай бяспекі нашай краіны. Ацаніць гэтую дзейнасць можна толькі праз прызму вырашэння канкрэтных пытанняў. Дробязяў пры гэтым не павінна быць. З малога складаецца ўсё вялікае.

Час вельмі складаны. Фактычна ідзе праверка на трываласць, на грунтоўнасць нашага суверэнітэту і дзяржаўнасці. Прычым пагрозы для нашай краіны фарміруюцца па-за межамі Беларусі і ў нас вельмі мала ўласных магчымасцей, каб супрацьстаяць гэтым пагрозам і выклікам. Але мы моцныя нашым адзінствам і згуртаванасцю нацыі вакол нашага Прэзідэнта — Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Дазвольце падзякаваць вам за сумесную плённую сесійную працу, павіншаваць з надыходзячымі Раством і Новым годам, пажадаць вам і вашым блізкім здароўя, дабрабыту, міру, ажыццяўлення вашых планаў і жаданняў!

АКЦЭНТ НА ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЗБАЛАНСАВАНАГА РАЗВІЦЦЯ ЭКАНОМІКІ І САЦЫЯЛЬНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асноўныя параметры бюджэту дазваляюць разлічваць, што планка сацыяльных абавязацельстваў дзяржавы ў галіне адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай палітыкі не будзе паніжана. Пры гэтым будзе працягнуты паслядоўны рух па шляху эвалюцыйных пераўтварэнняў у эканоміцы.

Падчас гэтай сесіі зроблены сур'ёзны крок у названым кірунку. Прававое афармленне атрымала дзяржаўна-прыватнае партнёрства. Прыняты Закон ужо ў найбліжэйшы час дазволіць пачаць рэалізацыю некалькіх буйных праектаў з дапамогай тэхналогій, капіталу і рэсурсаў прыватнага бізнесу. Гэта, безумоўна, знізіць нагрузку на рэспубліканскі бюджэт і падштурхне дзелавую актыўнасць у краіне.

Сур'ёзны эканамічны эфект плануецца атрымаць і ад уступлення ў сілу Ляснога кодэкса. Па ацэнках экспертаў, удасканаленне падыходаў да лесакарыстання дазволіць атрымліваць дадаткова ў бюджэт рэспублікі больш як 200 млрд рублёў штогод.

Задача раскрыцця ўнутраных рэзерваў развіцця эканомікі запатрабавала карэкцыі дзяржаўнай стратэгіі ў пытаннях падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, павышэння прамысловай бяспекі. Шэраг навацый унесены ў заканадаўства ў сферах будаўніцтва, гандлю, сельскай гаспадаркі, турыстычнай індустрыі.

Тэма стымулявання дзелавой актыўнасці знайшла сваё адлюстраванне і ў такім знакавым дакументе, як Кодэкс аб культуры. Упершыню на заканадаўчым узроўні ў гэтай галіне вызначана месца спонсарства і мецэнацтва, устаноўлены прававыя асновы супрацоўніцтва дзяржаўных органаў з камерцыйнымі арганізацыямі.

Праца над Кодэксам прыцягнула вялікую грамадскую ўвагу. І гэта не выпадкова, бо захаванне нацыянальна-культурнай самабытнасці шматразова павышае здольнасць народа супрацьстаяць негатыўным выклікам. У святле сучасных трывожных тэндэнцый гэта вельмі актуальна.

Беларусь — адкрытая краіна і ўцягнута практычна ва ўсе працэсы, якія адбываюцца на кантыненце. Няпростае міжнароднае становішча прымушае нас прымаць захады па апярэджанні пагроз, якія для многіх нашых суседзяў ужо ператварыліся ў сур'ёзныя праблемы. Адказам на гэтыя выклікі сталі папраўкі ў заканадаўства па пытаннях умацавання нацыянальнай бяспекі, барацьбы з тэрарызмам, аптымізацыі палітыкі ў дачыненні да мігрантаў і бежанцаў.

Сёння гэтая праблематыка ў цэнтры ўвагі ўсёй міжпарламенцкай супольнасці. Аб важнасці аб'яднання намаганняў у барацьбе з міжнародным тэрарызмам і экстрэмізмам, міграцыйных праблемах гаварылася на мерапрыемствах парламенцкіх структур Саюзнай дзяржавы, СНД, АДКБ, а таксама Міжпарламенцкага саюза.

Абмяркоўваючы гэтыя пытанні, беларускія парламентарыі заўсёды падкрэслівалі нязменнасць прынцыпаў нашай знешняй палітыкі — імкненне да міру, узаемапавага, раўнапраўнае супрацоўніцтва з усімі без выключэння партнёрамі. Любыя канфлікты павінны рэгулявацца палітыка-дыпламатычнымі метадамі. Мінск, які заваяваў рэпутацыю перагаворнай пляцоўкі, дзе могуць паспяхова вырашацца такога роду пытанні, гатовы і надалей выконваць гэтую ролю ў інтарэсах усіх краін.

Зразумела, пытанні калектыўнай бяспекі цесна звязаны з тым, як складваецца сітуацыя ў сусветнай эканоміцы. І дэпутаты імкнуцца максімальна выкарыстаць кожную магчымасць для ўмацавання эканамічных пазіцый Рэспублікі Беларусь. З гэтымі мэтамі мы пастаянна кантактавалі з замежнымі дыпламатамі і прадстаўнікамі міжнародных арганізацый. Па ініцыятыве нашых груп па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў у Палаце прадстаўнікоў прайшлі вельмі прадукцыйныя сустрэчы з калегамі з Ірака, Чэхіі і Эстоніі. Лічу, што аснова на будучыню створана нядрэнная, і сёння важна рухацца далей.

Яшчэ адзін дастаткова адказны кірунак нашай працы быў звязаны з электаральнымі мерапрыемствамі, якія праходзілі як у Беларусі, так і за мяжой. Я маю на ўвазе работу, праведзеную з міжнароднымі назіральнікамі ў рамках прэзідэнцкіх выбараў, якія прайшлі ў нашай краіне, і ўдзел беларускіх парламентарыяў у міжнародным назіранні за ходам выбарчых кампаній у Азербайджане і Кыргызстане, а таксама рэферэндуму ў Арменіі.

Цяпер некалькі слоў пра задачы на будучы перыяд. Год будзе няпростым. Працаваць давядзецца напружана — гэта катэгарычнае патрабаванне кіраўніка дзяржавы да ўсіх галін улады. І тое, што сёння Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнку дадзена згода на прызначэнне Андрэя Уладзіміравіча Кабякова прэм'ер-міністрам, — вельмі значны факт. Мы робім агульную справу, і вельмі важна захаваць усё, што дапамагае сёння Парламенту і Ураду эфектыўна ўзаемадзейнічаць пры вырашэнні агульнадзяржаўных задач.

Паважаныя калегі, самую пільную ўвагу прашу надаць падрыхтоўцы законапраектаў. Да канца склікання ўсе напрацоўкі трэба рэалізаваць. Галоўны акцэнт пры гэтым павінен быць зроблены на якасці дакументаў.

Неабходна звярстаць змястоўную праграму міжнароднай дзейнасці. Найважнейшымі падзеямі тут для нас стануць бюджэтная сесія Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, зімовае пасяджэнне Парламенцкай асамблеі АБСЕ і 134-я Асамблея Міжпарламенцкага саюза. Удзел у рабоце гэтых структур патрабуе самай сур'ёзнай падрыхтоўкі.

Варта таксама чакаць станоўчай дынамікі абмену візітамі. Мяркуецца, што беларускія парламентарыі наведаюць Інданезію, Латвію, Тайланд і Чэхію. У сябе мы плануем прыняць дэлегацыі з Балгарыі, Грузіі, Пакістана і Таджыкістана.

Ну і вядома, у 2016 годзе Беларусь зноў прыцягне ўвагу міжнароднай грамадскасці, гэтым разам ужо ў сувязі з парламенцкімі выбарамі. Цалкам прадказальна, што выбарная тэматыка таксама будзе ўключана ў міжнародны парадак дня.

Што датычыцца працы ў выбарчых акругах, то ў перыяд зімовых свят яна праходзіць пад знакам удзелу ў традыцыйных дабрачынных акцыях, мэта якіх у тым, каб ні адно д

ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 11 (51)

■ Нашы дзеці

ПАДАРУНКІ СПЕЦЫЯЛЬНАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ

Напярэдадні навагодніх свят выхаванцаў Андрэеўскага дзіцячага дома павіншаваў міністр абароны. Андрэй РАЎКОЎ уручыў хлопчыкам і дзяўчаткам падарункі. Святочны настрой стварылі артысты Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл і дзіцячай студыі «Зорачка».

Галоўнае ваеннае ведамства краіны звязвае з дзіцячым домам даўняя дружба. Ужо традыцыяй стала аказанне дапамогі дзецям. Незалежна ад свят і дат людзі ў пагонах рэгулярна дапамагаюць выхаванцам у набыцці патрэбных рэчаў. Сёлета, напрыклад, для іх былі закуплены гульнявая пляцоўка і пясочніца, камплекты спартыўнага адзення і абутку. Акрамя таго, падчас правядзення бягучага рамонту Галоўнае ўпраўленне будаўніцтва і эксплуатацыі Узброеных Сіл забяспечыла дзіцячы дом будаўнічымі матэрыяламі агульным коштам 576 мільёнаў рублёў.

Толькі за апошнія пяць гадоў у межах аказання шэфскай дапамогі ў Андрэеўскім дзіцячым доме былі адрамантаваны, укамплектаваны мэбляй і абсталяваны неабходнай бытавой тэхнікай 5 кватэр сямейнага тыпу для дзяцей-сірот, ажыццёўлены рамонт і абсталяванне актавай залы дзіцячага дома, навучальных класаў, сталовай; набыты абсталяванне для камп'ютарнага класа на 12 працоўных месцаў, камплект музычнай апаратуры для актавай залы, вялікі плазменны тэлевізар і маразільнік, школьныя прылады

Фота БЕЛТА.

для выхаванцаў; выраблены альтанкі, сталы, тумбачкі.

Штогод для выхаванцаў арганізаваны наведванні Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча, Драматычнага тэатра беларускай арміі, Беларускага дзяржаўнага цырка. Сёлета ў дзіцячым доме зарадзілася і яшчэ адна традыцыя — экскурсія ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Дзеці з нецярпеннем чакаюць вясны, каб яшчэ раз апынуцца ў храме ваенных рэліквій.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

■ Прыярытэты

МАБІЛЬНАСЦЬ, БЕСПЕРАПЫННАСЦЬ І ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ

Гучней на стрэльбішчах, цішэй — на межах

У беларускай арміі пачаўся новы навучальны год. Ён абяцае запомніцца шырокай геаграфіяй і разнастайнасцю ўзаемазвязаных задач.

Звяртаючыся на аператыўным зборы да кіруючага складу арміі, Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі Беларусі падкрэсліў, што «мы з'яўляемся сведкамі геапалітычных працэсаў, якія непазбежна вядуць да трансфармацыі сістэмы міжнароднай бяспекі... Трывожныя сігналы раздаюцца непасрэдна ля нашых межаў, і трэба быць гатовым да рэагавання на новыя выклікі і пагрозы».

Дынаміка ваенна-палітычнага становішча шмат у чым абумоўлівае змяненне формаў і спосабаў барацьбы. У апошніх у нашы дні недахопаў дакладна няма. А вось у дыфузнай, або яе яшчэ называюць сеткавай ці гібрыднай, вайне не перамагчы, калі забыўся пра такое, здавалася б, звычайнае паняцце, як штодзённая вучоба. Яна і стане сэрцам усіх працэсаў, якія чакаюць войскі ў 2016 годзе.

Год баявой падрыхтоўкі. Упершыню менавіта так — лаканічна і суха — камандаваннем вызначана сутнасць новага этапу развіцця. Да чаго такая катэгарычнасць? Адказ просты. Калі правілы гульні на планеце змяняюцца з рэактыўнай хуткасцю, «стоп-кранам» вайны гарантавана могуць служыць толькі натрэніраваныя войскі. Іншых варыянтаў не існуе.

Яшчэ не так даўно любы канфлікт паміж краінамі прадугледжваў час на разгортванне груповак. Сёння ўдары наносяцца ў самы непрадказальны момант і ў самым нечаканым месцы. Усё гэта дыктуе неабходнасць скарачэння рэагавання на любыя раздражняльнікі. Таму мабільнаму кампаненту арміі аддаецца прыярытэт. Зрэшты, у 2016-м павялічыцца і ўдзельная вага часцей, здольных імгненна разгарнуць сілы на шляху пагрозы. Наносіць непрымальны ўрон малымі сіламі і без страт вайскоўцы будуць вучыцца бесперапынна. На парадку дня — праверкі, вучэнні, стрэльбы.

Тонус трэніроўкам нададуць двухбаковы характар і выкарыстанне войскаў абазначэння. Для паўнаты карціны на падраздзяленні ў ходзе манеўраў будзе аказвацца агнявое, радыёэлектроннае, інфармацыйнае ўздзеянне. У 2016 годзе не прадугледжана буйнамаштабных вучэнняў узроўню «Шчыт Саюза» або «Захад». Новы перыяд адводзіцца на глыбокую рэвізію тактычнага звяна. Пры гэтым працягнецца практыка трэнінгаў з замежнымі калегамі. Перш за ўсё, па лініі АДКБ. У інтарэсах баявой падрыхтоўкі будзе арганізаваны і ўдзел у міжнародных вайсковых гульнях.

Апошнім часам задач у галіне абароны становіцца ўсё больш. І беларускай арміі для іх вырашэння неабходна павялічваць абароты. Таму і ў гэтым навучальным годзе кананада на палігонах сціхаць не будзе. Што ж, чым гучней на стрэльбішчах, тым цішэй на межах.

Канстанцін ГАГАРЫН

■ Рэпартаж



ЯК-130.

МІГ-29.

У НЕБЕ — «ЖАЛЕЗНЫЯ ПТУШКІ»

Дзесяць самалётаў «МіГ-29» папоўнілі авіяпарк 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы, два штурмавікі «Су-25» прызямліліся на аэрадроме 116-й штурмавой авіябазы

Лётчыкі палётамі задаволены.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Адзін за адным пілоты ўздымаліся ўвысь. Жалезныя птушкі рассякалі паветраную роўнядзь. У гэты дзень у небе над Баранавічамі можна было назіраць сапраўднае паветранае шоу. Так лётчыкі пачыналі новы навучальны год і радаваліся найлепшаму для іх падарунку — ваеннай тэхніцы, якую ў 61-ю знішчальную авіяцыйную базу перадалі пасля капітальнага рамонту.

У красавіку 2014 года па даручэнні Прэзідэнта Беларусі на планавы капітальны рамонт на 558-ы авіяцыйны рамонтны завод, што ў Баранавічах, паступілі дзесяць самалётаў «МіГ-29». Сёлета, у першы дзень зімы, яны, як новенькія, стаялі на аэрадроме авіябазы. Неўзабаве зараўлі маторы — і знішчальнікі схаваліся за ранішнімі аблокамі. Сумненняў не ўзнікала: ужо сёння і тэхніка, і лётчыкі гатовы да выканання задач па абароне паветраных рубяжоў нашай краіны.

— Мы сталі сведкамі знамянальнай падзеі ў жыцці Узброеных Сіл, — падкрэсліў **намеснік міністра абароны па ўзбраенні — начальнік узбраення Узброеных Сіл генерал-маёр Ігар ЛАЦЯНКОЎ**. — Увод у строй адрамантаваных лятальных апаратаў быў рэалізаваны з прыцягненнем вытворчых магутнасцей 558-га авіяцыйнага рамонтнага завода. Ва ўстаноўленыя тэрміны лятальныя апараты былі адрамантаваны і, у адпаведнасці з графікам пастаўкі, прыняты ў склад 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы.

Яшчэ два самалёты — штурмавікі «Су-25» — пасля капітальнага рамонту сустракалі ў той дзень у Лідзе, дзе дыслакуецца 116-я авіябаза. Ад старой авіятэхнікі, па сутнасці, засталіся толькі карпусы. Але нават іх нядаўна пафарбавалі, таму самалёты выглядаюць як новенькія. Літаральна з канвеера і многія дэталі: «начынку» ў самалётах амаль поўнасцю замянілі. А як прызнаўся **намеснік камандзіра 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы па бяспецы палётаў падпалкоўнік Мікалай ШЫРОКІ**, у самалётах усталявана дадатковая апаратура, якая павышае іх баявыя магчымасці. «У прыватнасці, сістэма аб'ектыўнага кантролю, што дазваляе больш дэталёва аналізаваць палёт лётчыка, — расказаў лётчык-знішчальнік. — Спецыяльная відэакамера фіксуе ўвесь палёт у рэжыме рэальнага часу, чаго раней не было на самалётах. Аналізуючы свой палёт на зямлі, лётчык зможа прадухіліць памылку ў небе».

Дарэчы, пяць з дзесяці адрамантаваных знішчальнікаў даверылі выпускнікам Ваеннай акадэміі двух апошніх гадоў. Сёння лейтэнанты ў небе дакazалі, што самалёты — у надзейных руках.

ЕЖУ ГАТУЕМ ХУТЧЭЙ ЗА РАСІЯН

Амаль тры з паловай гадзіны на дзень беларусы трацяць на вядзенне гаспадаркі і догляд дзяцей. Пенсіянеры займаюцца хатнімі справамі на дзве гадзіны больш, чым тыя, хто працуе. Асноўная нагрузка, вядома, на жанчынах. Яны на гадзіну больш праводзяць за плітой, на 20 хвілін даўжэй мыюць посуд і на 18 хвілін больш мыюць адзенне і бялізну і чысцяць абутак. Амаль шэсць працэнтаў мужчын увогуле нічога не робяць па доме. Хоць трэба аддаць ім належнае: будаўніцтвам і рамонтам машыны пераважна займаюцца мужчыны.

Багатыя сем'і могуць дазволіць сабе траціць на хатнія справы на 23 хвіліны ў дзень менш, чым людзі з нізкім прыбыткам, і на 10 хвілін больш праводзіць у крамах.

Дзеці ва ўзросце 10-15 гадоў штодзень аддаюць на працу па доме амаль гадзіну. Траціна падлеткаў мые посуд, чвэрць самі гатуюць сабе ежу і даглядаюць свойскіх жывёл. Сем працэнтаў дзяцей мые адзенне і прасуе.

У пытаннях хатняй гаспадаркі беларусы падобныя да палякаў. А вось у параўнанні з расіянамі ёсць адрозненні: з прыгатаваннем ежы і мыццём посуду мы спраўляемся на 20 хвілін хутчэй за нашых суседзяў.

ГАЛОЎНЫ ТЭЛЕГЛЯДАЧ — МУЖЧЫНА НА ПЕНСІІ

Вольнага часу ў беларуса — чатыры з паловай гадзіны на дзень. Прычым у мужчын яго на паўгадзіны больш, чым у жачын, у будні і на паўтары — па выхадных. Амаль палову гэтага часу насельніцтва траціць на сродкі масавай інфармацыі.

— У 21.30 перадачы глядзяць 33 са 100 жанчын і 40 са 100 мужчын. Гэты час — самы пікавы па праглядзе тэлевізара, — канстатуе Іна Каншонак.

Больш за ўсіх перад «скрыняй» праседжваюць пажылыя мужчыны — 3 гадзіны 19 хвілін за дзень. А мастацкую літаратуру часцей чытаюць дзяўчаты-падлеткі — па 17 хвілін штодня.

15 працэнтаў вольнага часу ідзе на размовы. Яшчэ па дзевяць працэнтаў прыпадае на актыўную дзейнасць і хобі. Толькі чатыры хвіліны на дзень сярэднестатыстычны жыхар нашай краіны траціць на наведванне тэатраў і музеяў. Столькі ж ідзе на заняткі спортам (хоць на актыўныя віды дзейнасці беларусы аддаюць каля паўгадзіны, яны пазбягаюць інтэнсіўных нагрузак і аддаюць перавагу звычайнаму шпацыру). Цікава, што сёння ў нас вольнага часу на 40 хвілін больш, чым дзесяць гадоў таму. Праўда, ідзе ён... у нікуды. Згодна з даследаваннем, мы амаль 40 хвілін у суткі нічога не робім.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Запрашае часопіс «Бярозка»

ВЕСЕЛА, ПАВУЧАЛЬНА, ІНТЭРАКТЫЎНА!..

Аб'яву з інтрыгуючым запрашэннем чыталі ўсе — і дарослыя, і дзеці. Зазіралі ў бібліятэку, цікавіліся: «Што, сапраўды часопіс прыязджае? Жыўцом?» Насамрэч, літаратурныя гасцёўні «Бярозкі» ўжо сталі школьнай традыцыяй: адна з іх, для навучэнцаў сёмых класаў, адбылася ў кастрычніку; другая, для шасцікласнікаў, — у лістападзе. Цяпер вось да снежня дабраліся.

Нядзіўна: часопіс у нас у пашане. Кожны клас выпісвае. Кожны вучань чытае. Чаму? Таму што гэта цікава. Весела. Павучальна. Займальна. Інтэрактыўна. Актуальна. Модна, урэшце.

А яшчэ таму, што «Бярозка» піша пра нашу школу. І нашы дзеці пішуць для «Бярозкі». Стараюцца вельмі. І радуюцца, калі атрымліваецца сапраўдная публікацыя. Вядома — яшчэ толькі вучань, а ўжо — аўтар! Школа ўваходзіць у склад савета чытачоў часопіса. І сябруе з ім у сацыяльнай сетцы «УКантакце», дзеліцца навінамі з сябрамі, бацькамі і калегамі. Такая вось віртуальная «бярозавая» сетка атрымліваецца.

Сама сустрэча адбываецца, нагадаем, у бібліятэцы. За круглым сталом збіраюцца вучні і выкладчыкі. Чытаюць артыкулы, абменьваюцца думкамі, спрабуюць выступіць у якасці дарадчыкаў для герояў рубрыкі «Сітуацыя плюс». Задаюць пытанні нашым аўтарам — іх пакуль што тры — Павел Ародзь, Ліза Сцяцко і Галіна Анатольеўна Богдан, нязменная вядучая рубрыкі «Сітуацыя плюс».

Трое, а хацелася б болей! Гэтаму і прысвечана другая частка гасцёўні — абмяркоўваюцца будучыя артыкулы будучых аўтараў.

— Хто б мог напісаць для «Бярозкі» рэпартаж пра цікавую падзею? — пытаецца гаспадыня гасцёўні Ніна Аляксандраўна Мінько.

Тры рукі падымаюцца ўгору пакуль што нерашуча.

— А хто на інтэрв'ю з мэрам замахнецца? — усміхаецца Галіна Анатольеўна.

— А можна? — задыхаюцца ад захаплення хлопчыкі, выкідаючы ўгору далоні.

— Для «Бярозкі» можна. А хто казку прыдумае?

І ажываюць вочы, і свецяцца загадкавымі ўсмешкамі твары, і пачынае працаваць дзіцячая фантазія. Безумоўна, не ўсе сённяшнія энтузіясты будуць аўтарамі часопіса. Але даць ім такую магчымасць, абудзіць зацікаўленнасць да творчага самавыяўлення, да чытання, прадэманстраваць унікальнасць выдання па сілах кожнай школе. Тым больш што рэдакцыя вітае і падтрымлівае ініцыятыву дзяцей.

У перспектыве гасцёўні плануецца рабіць адкрытымі, гэта значыць выкладаць інфармацыю і фотаздымкі ў школьных сецевых суполках, далучаць бацькоў, выкладчыкаў, вучняў.

А яшчэ мы вельмі спадзяёмся на працяг нашага сяброўства з «Бярозкай», новыя цікавыя тэксты, новыя яркія літаратурныя падзеі.

Галіна БОГДАН,
намеснік дырэктара
па выхаваўчай рабоце
СШ №12 г. Гродна

■

НОЧ ПАСЛЯ ВЯСЕЛЛЯ

Усё змяшалася ў доме Лук'янавых. На заўтра было запланавана вяселле старэйшага сына Антона, і яго бацькі ўжо каторы дзень знаходзіліся пад цяжарам недаробленых і непачатых спраў. У сталовай наразаліся салаткі і ўкладваўся селядзец пад футра, па дарозе цыркулявалі машыны з крэсламі, прадуктамі і караваямі, жанчыны дамаўляліся з цырульніцамі і кветачніцамі. І ў гэтай мітусні трэба было сустракаць гасцей.

А яны — з розных канцоў краіны і блізкага замежжа, вызваленыя ад абавязкаў, ужо трымалі курс на пасёлак Зашыр'е Ельскага раёна.

Мы прыехалі невялікім складам у сярэдзіне дня. Гаспадары паставілі на стол талеркі з гарачым, графін з моцным і пасля абдымкаў, пацалункаў і паспешлівых размоў пакінулі нас, каб вярнуцца да спраў. Мы, дзякуй Богу, былі гасцямі самастойнымі і неўзабаве ўжо па тэлефоне ўдакладнялі, з чаго б нам зноў напоўніць графін, ды жартавалі, што пасля такіх «нерваў» бацькі замест пажаданняў скажуць маладым: «Не дай Бог разведзяцеся...».

Між тым да дома падбіраліся дзядзькі, цёткі, браты, сёстры, іх жонкі, мужы, дзеці («бач, як вас распадзілася!..»). З некаторымі мы рэдка сустракаліся, з некаторымі — незнаёмыя ўвогуле. Са славутага Санкт-Пецярбурга прыехаў прамысловец і паэт дзядзька Саша, прывёз з сабой двух сыноў, каб тыя сябе паказалі ды на іншых паглядзелі...

Шчасце ад сустрэчы са сваякамі даводзіла да замірання ўнутраных органаў: вяселле, як яму і належыць, стала падставай абняць і расцалаваць вялікую радню, пажартаваць наконт «прычоскі як пасля шторму, гы-гы-гы», успомніць продкаў, выпіць за іх. І, вядома ж, не толькі....

Аднак, ва ўсяго добрага ёсць пачатак канца. На другі дзень, у той час, як вяселле яшчэ працягвалася, прамысловец і паэт дзядзька Саша з сынамі сабраўся дамоў. Усмешкі з твараў сцерліся, жанчыны пусцілі слёзы, мужчыны сталі спехам наліваць «па апошняй» (ну, для кагосьці апошняй). Нехта, пазбавіўшы тамаду мікрафона, выдаў спіч пра адзінства нашага роду. А калі нарэшце былі агучаны развітальныя словы і машына рушыла, з'явілася непрыемнае пачуццё надыходзячага канца. Расхвалявалiся, пацішэлі, расклеіліся...

Але ж музыка трымала ранейшы рытм, і страта байцоў хутка адышла на другі план. На вяселлі засталіся самыя стойкія. Яны арганізавалі сабе асобны стол з найлепшымі салатамі, заспявалі пад гітару і не заўважылі, як павечарэла, як адчыніліся дзверы і... у залу ўвайшоў дзядзька Саша ўласнай персонай, прамысловец і паэт! Ён карцінна развёў рукамі, гучна сказаў: «Так, я «лапухнуўся!» і запатрабаваў наліць яму выпіць.

Агульнае здзіўленне змянілася гамерычным смехам, калі высветлілася, што Саша, праехаўшы дзвесце кіламетраў, вярнуўся, таму што пакінуў у доме свой пінжак з кашальком і дакументамі.

Прыгледзеліся — пінжак на ім надзеты, праўда, рукавы караткаватыя, ды па колеры да штаноў не пасуе.

«Следства» выявіла, што гэты шчасліўчык з раніцы прыбраўся, паляпаў сябе па грудзях і, намацаўшы кашалёк, спакойна адправіўся святкаваць другі дзень вяселля. «Падлог» выявіўся толькі на запраўцы, калі дзядзька Саша, дастаючы грошы, выцягнуў з кішэні вадзіцельскія правы з тварыкам свайго брата, бацькі маладога.

«Мог бы не вяртацца, — сказаў той, — я на твае грошы лазню дабудаваў бы». Але на самай справе кожны быў рады гэтай памылцы, бо ў нашым, лук'янаўскім, распараджэнні аказалася яшчэ адна ноч.

Ірэна Лук'янава,
г. Мінск

СТАРШЫНЯ МІЖ ТЫМ — НІ ПРЫ ЧЫМ

...Баюся ўспамінаць пасляваеннае мінулае і, у прыватнасці, як жа цяжка рубцаваліся раны, як доўга паўставала з руін краіна, як падымала сельскую гаспадарку. Не было для гэтага ні тэхнікі, ні ўгнаенняў. Усё, што магло хоць неяк паспрыяць урадлівасці, шукалі, як крумкач косці. Нас, школьнікаў, помню, прымушалі збіраць па хатах попел і вазіць на калгасныя палі.

Адчуваўся і недахоп кіраўнікоў-мужчын.

Каб ліквідаваць яго, партыя кінула кліч да гараджан і, для пад'ёму эканомікі, накіравала ў вёскі каля 30 тысяч рабочых і служачых. Сіла, здавалася б, але многія з гэтых добраахвотнікаў павыраставалі ў гарадскіх умовах, яны курыцы жывой ніколі не бачылі, а тут якія-ніякія, але ж коні, каровы, фермы, палеткі — калгас. Ім трэба кіраваць...

Адзін з такіх начальнікаў трапіў і ў нашы мясціны, стаў старшынёй. Звалі партыйца Макар Пятровіч Бухароў. Што калі рабіць — у якія тэрміны якую культуру сеяць і калі ўбіраць — ён спачатку нават уяўлення не меў. Усё вырашалі вышэйшыя партыйныя ўлады. Але ж і Макар Пятровіч без справы не сядзеў. Ён сачыў за парадкам, стараўся трымаць дысцыпліну. І з людзьмі, дзякаваць Богу, не лютаваў. Вяскоўцы паважалі яго за пасаду, за знешнюю культуру, за рускую мову...

Але ж павага павагай, а голад голадам: ён, як вядома, не цётка. І нават не дзядзіна — з'ясі і крадзена.

Дык вось. Неяк раз дзве суседкі, Волька і Марыля, цэлы дзень крукам прастаяўшы ў баразне (калгасную бульбу выбіралі тады ўручную, за плугам), прыкмецілі, што як ты зямлю не перабірай, а клубні ўсё ж застаюцца: недзе плуг на камень наскочыць, недзе араты спудлуе, а то і конь... Глядзіш, кусцікдругі ў зямлі...

Шкада іх калгасніцам, бо прападзе ж дабро, змерзне, згніе, а дома — дзеці...

Факт, што пашапталіся яны і, калі прыцямнела, з кашамі, з рыдлёўкай падаліся на бульбянішча. Вольцы гэта лягчэй было, бо яна даўганогая, дужая, спрытная, а вось Марыля... Мала таго, што яна ростам не выйшла, што цяжарная, дык яшчэ і баязлівая. Збірае тую бульбачку ды трасецца:

— Вой, зловіць старшыня... Вой, бяды нам будзе...

Накаркала, карацей: конь як быццам іржэ? Паднялі галовы — і сапраўды: хуткім крокам ідзе да іх Бухароў (на калёсах па калдобінах не разгонішся).

— Уцякайма! — крыкнула Волька, схапіла рыдлёўку, свой кош з бульбай і кінулася да бліжэйшага лесу.

Марыля, вядома ж, за ёй. І добра, каб лес той быў блізка, а то ж... Задыхаліся кабеты, узмакрэлі. Волька на Марылю азірнецца, спытае: «Ну што — бяжыць старшыня?» Тая кажа: «Бяжыць», бо азірнуцца проста не можа.

З апошніх сіл жанкі ўцякалі... І такі ж уцяклі. У лесе аддыхаліся крыху ды пакіравалі дадому. Зноў жа з прыгодамі: па дарозе Марыля нарадзіла хлопчыка — без пары, але, дзякуй Богу, здаровага.

Назвалі малога Косцікам. А мянушка прыляпілася неяк сама — Бухароў. Хоць ён, калі разабрацца, быў ні пры чым.

Ці ўсё ж пры чым?

Н.С., *г. Слуцк*

P.S. *Шмат гадоў пасля гэтага прайшло, але я і цяпер не разумею, у чым быў крымінал? Чаму пасля асноўнай уборкі ўраджаю нельга было дазволіць калгаснікам перакопваць, пераворваць тое ж бульбянішча, каб хоць так аддзячыць за працу? Чаму так доўга людзі на вёсцы працавалі за так званыя «палачкі», а па сутнасці — задарма?*

ПРА КАЗЛА, ЯКІ НЕ БАІЦЦА НІЧОГА, АПРОЧ...

Наша лецішча знаходзіцца на пачатку маладзечанскага ўзвышша, у мясцовасці, якую трапна называюць «беларускай Швейцарыяй»: бо ў нас, як і ў той, сапраўднай Швейцарыі, ёсць і горы, і даліны, ёсць сцежкі, якія іх звязваюць. Жарты жартамі, а з ганка нашай дачы, напрыклад, можна бачыць, як уніз, праз мястэчка, да якога не менш за кіламетр, вусенем паўзе цягнік...

Экзотыка! І прытым прыгожая!

Але ж тут не пра яе — вернемся да сцежак.

Адна з іх надзейна звязвае нашы дачы з тым мястэчкам, з чыгуначнай станцыяй. І *да* яе і *ад* яе недзе з мая па кастрычнік пастаянна ходзяць людзі. Тут жа, ля сцежкі, местачкоўцы пастаянна навязваюць коз. Чаму, здагадацца няцяжка: жывёліны прывучаны да рук, да пастаянных пачастункаў. З дому выходзіш, — нешта, вядома ж, бярэш. Не сам, дык дзеці залямантуюць, што дзяліцца трэба!

Дык вось. Неяк надвячоркам пасля дачнага працоўнага «ўікэнда» вяртаюся я ў Мінск і толькі збочваю на заўсёдную сцежку, як з падлеску з трэскам выскокваe... казёл. Ды такі барадаты, вялізны, ззаду ланцуг жалезны грыміць... У мяне ад нечаканасці аж сумка з рук выпала.

А казёл між тым пачынае не проста жабраваць ці гасцінца выпрошваць, а хоча... зарабіць яго, каб усё «па-чэснаму». Давай ён, значыць, вакол мяне кругі наразаць ды выбрыкваць, давай розныя гімнастычныя фінты паказваць. Каронны нумар — падскочыць і пярэднімі нагамі быццам на плечы мне хоча стаць, у вочы зазірнуць, пакланіцца... Ну чыста артыст!

Я яму за гэта выступленне булачку дала і пайшла б сабе, бо на электрычку спяшалася. Але ж крокаў праз пяць сцежку мне зноў заступіў казёл: ён хацеў прадоўжыць сваё выступленне.

Давялося яшчэ раз паглядзець, потым — пачаставаць, зрабіць пяць крокаў і...

З такімі вось непрадбачанымі «прыгодамі» я прайшла ўсё поле, потым — мост праз рэчку. А далей...

Я ласкава прасіла казла адчапіцца ад мяне, вярнуцца назад, я размахвала сумкай, крычала на яго... Той , што называецца, слухаў і вухам не вёў.

Мяне тым часам ахапіў сапраўдны адчай: «на гарызоце» паказалася станцыя, і я ўяўляла, як зараз, з гэтым казлом, узыду на перон...

Трэба было шукаць выйсце. «Уключыла» мазгі, падумала, што казёл гэты — не іначай Янкаў: у яго досыць вялікі статак. Успомніла, як гаспадар па вечарах заганяў яго ў хлеў і звычайных людскіх слоў у яго лексіконе тады не было — спрэс мацюкі.

Вось гэтым я і надумала скарыстацца: азірнулася (каб людзі, бронь Бог, не пачулі), набрала ў грудзі паветра і...

Спачатку атрымалася ціха — казёл на мяне толькі паглядзеў, потым — мацней (ён насцярожыўся), а потым мяне панесла, не раўнуючы, як тога Астапа. Я сказала казлу ўсё, што думала — пра яго, ягоных продкаў, людзей з казлінай «упартасцю»...

«Артыст» уважліва слухаў. У нейкі момант, мне падалося, што ў яго вачах прамільгнула захапленне, змяшанае з жахам, і морда ў казла неяк выцягнулася. Пасля чаго мой праважаты нарэшце падбрыкнуў і, загрымеўшы ланцугом, знік у зваротным напрамку. ...На электрычку я, дзякуй Богу, паспела. І амаль усю дарогу да Мінска думала пра сілу прывычкі, пра тое, што добрыя словы яны, вядома ж, прыемныя — для ўсіх, у тым ліку і казлоў. Але ж нешта давесці Янкавым можна толькі матам.

Таццяна Гаральчук, *г. Мінск.*
Рубрыку вядзе
Валянціна ДОЎНАР. *dounar@zviazda.by*

РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА»
(ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Лот №1	Легковой вагон Volkswagen Transporter, рег. № 9597 ВР-7, кузов (VIN) № WV2ZZZ70Z1H103889, год выпуска – 2001 г., местонахождение – г. Минск, ул. Чапаева, 4	Начальная цена с НДС, бел. рублей: 47 880 000	Задаток с НДС, бел. рублей: 2 394 000	Шаг аукциона, %: 5
Лот №2	Грузовой вагон Volkswagen Transporter, рег. № МА 0318, кузов (VIN) № WV1ZZZ70Z2H129119, год выпуска – 2002 г., местонахождение – г. Минск, ул. Чапаева, 4	Начальная цена с НДС, бел. рублей: 71 160 000	Задаток с НДС, бел. рублей: 3 558 000	Шаг аукциона, %: 5
Лот №3	Грузовой вагон Volkswagen Multivan, рег. № 0707 МАО, кузов (VIN) № WV2ZZZ70Z2H066900, год выпуска – 2001 г., местонахождение – г. Минск, ул. Чапаева, 4	Начальная цена с НДС, бел. рублей: 87 120 000	Задаток с НДС, бел. рублей: 4 356 000	Шаг аукциона, %: 5
Лот №4	Легковой вагон Volkswagen Transporter, рег. № 9911 ААХ, кузов (VIN) № WV2ZZZ70Z3X029931, год выпуска – 2003 г., местонахождение – г. Минск, ул. Чапаева, 4	Начальная цена с НДС, бел. рублей: 38 280 000	Задаток с НДС, бел. рублей: 1 914 000	Шаг аукциона, %: 5
Лот №5	Легковой хэтчбэк Volkswagen Polo, рег. № 6634 IX-7, кузов (VIN) № WVWZZZ6NZ1Y304716, год выпуска – 2002 г., местонахождение – г. Минск, ул. Чапаева, 4	Начальная цена с НДС, бел. рублей: 36 960 000	Задаток с НДС, бел. рублей: 1 848 000	Шаг аукциона, %: 5

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1 и (или) Лот №2 и (или) Лот №3 и (или) Лот №4 и (или) Лот №5 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота (ов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Валюта торгов – белорусский рубль. Валюта платежа – белорусский рубль.
Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе производится в белорусских рублях.
Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота №1 и (или) Лота №2 и (или) Лота №3 и (или) Лота №4 и (или) Лота №5 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится 18.01.2016 в 11.00
по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, д. 25, 2 этаж, каб. 209

Задаток перечисляется до 13.01 2016 на р/с 3012001673822 в ЦБУ №538 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, ул. Коржа, 11А, код 369. Получатель – РУП «Жилкоммунтехника», УНП 100135569. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №__), **проводимом 18 января 2016 г.**
Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.
Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них.
Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.
Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 13.00, с 13.00 до 17.30 по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 25, каб. 209.
Форму заявления и приложения к заявлению можно получить по факсу: 8017 204-78-81 или через запрос на e-mail: jkt@tut.by. Окончание приема заявлений – **13.01.2016 в 11.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта (Объектов): Почопко Вадим Леонович, (017) 204-71-51, (029) 147-24-89.
Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов.
Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона.

☎ Организатор: 8 (017) 204-71-51, 8 (029) 698-51-76, 8 (029) 395-36-35
• e-mail: jkt@tut.by

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 43 (300)

■ Кінакрокі

ЛЮБЫ КАНЕЦ ДЛЯ НЕЧАГА СТАНОВІЦЦА ПАЧАТКАМ

Імёны залатога перыяду беларускага кінематографа


Віктар ТУРАЎ.

Міхаіл ПТАШУК.

На гэтым тыдні беларускае кіно адзначыла сваё 91-годдзе. Кінематаграфісты абмеркавалі мінулы год, праблемы сучаснасці і агучылі планы на будучыню. Спіс вынікаў заўсёды аказваецца ўражальным, але адна падзея гэтага года мае асаблівае значэнне. У кастрычніку на сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў было прынята рашэнне, адпаведна з якім дзве мінскія вуліцы (яны яшчэ праектуюцца) у жылым раёне Лошыца названыя імёнамі выдатных беларускіх рэжысёраў — Віктара Турава і Міхаіла Пташука. Горад будзе славіць тых людзей, што сваёй творчасцю славілі цэлую краіну. Нарэшце гэта пацвярджае, што трэба не толькі выстройваць стратэгію развіцця кінематографа, але і азірацца на імёны, што з'яўляюцца яго падмуркам.

У Мінску ўжо ёсць адна вуліца, прысвечаная беларускаму кінарэжысёру, — вуліца Уладзіміра Корш-Сабліна, піянера айчыннага кінематографа, аўтара фільмаў «Дачка Радзімы», «Мая любоў», «Новы дом», «Канстанцін Заслонаў», «Хто смяецца апошнім» і выканаўца ролі другога плана ў карціне «Лясная быль» Юрыя Тарыча, якая лічыцца першым беларускім фільмам.

Складана сказаць, якімі крытэрыямі кіравалася Камісія па называнні і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых састаўных частак Мінска, прымаючы рашэнне (вядома, што прадстаўнікі Міністэрства культуры і творчых аб'яднанняў звярталіся ў Мінгарвыканкам з ідэяй назваць мінскія вуліцы імёнамі Турава і Пташука), але вылучэнне менавіта гэтых рэжысёраў выглядае цалкам лагічным.

Гэтыя імёны закальцоўваюць «залаты перыяд» беларускага кіно, які прыпаў, умоўна кажучы, на дваццаціпяцігоддзе ў 1960-1980-я гады. З Турава ён пачаўся, Пташук да 2000-х заставаўся самым выдатным «выхадцам» з таго «веку росквіту».

На момант 1960 года беларускі кінематограф ледзь-ледзь дыхаў і нагадваў выпаленае поле. 1961 год стаў пераломным: на кінаэкраны вылучылася маладое пакаленне вгікаўцаў — Ігар Дабралюбаў, Барыс Сцяпанаў, Валерый Рубінчык, Віталь Чацверыкоў. Потым іх назавуць «шасцідзясятнікамі». Віктар Тураў, які ў 1959 годзе яшчэ студэнтам саюзнага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі прыйшоў працаваць на кінастудыю «Беларусьфільм» і пачаў здымаць дакументальныя фільмы, стаў лідарам новага пакалення кінематаграфістаў...

Класік украінскага кіно Аляксандр Даўжэнка набіраў сваю майстэрню ў інстытуце кінематаграфіі ў Маскве адзін раз у жыцці — у гэту майстэрню трапіў Віктар Тураў. «Калі мы — яго вучні — зрабілі нешта вартае — гэта ў першую чаргу заслуга Аляксандра Даўжэнкі, — расказваў Тураў у дакументальным фільме пра самога сябе, створаным на «Беларусьфільме». — Ён быў улюбёны ў зямлю, і гэтую сваю любоў, якая прайшла праз усе яго фільмы, ён нам перадаў». Ужо ў 1964 годзе рэжысёр зняў карціну «Праз могілкі», заснаваную на аўтабіяграфічным матэрыяле. Менавіта яна ў 1995 годзе ўвайшла ў спіс ста найлепшых фільмаў ЮНЕСКА пра вайну.

Бессюжэтныя ваенныя карціны Турава не проста занялі нішу, яны сталі нечым незвычайным, новым — жанрава і «ідэалагічна». Пачуцці і ўражанні перадаваліся «паветрана-капельным шляхам», а вайна была пазбаўлена статуса «свяшчэннай».

Невымоўная туга, душэўныя пакуты, людзі ва ўмовах вайны, дзеці на вайне выглядалі натуральна, бо сам Тураў памятаў часы вайны даволі дакладна і жыва. Дзень, калі яго бацька-партызан прыйшоў наведаць сям'ю, і яго адразу арыштавалі. Як яго дзед аддаў маці апошні тытунь, каб тая адвезла яго бацьку ў турму. А калі маці вярнулася, стала зразумела без слоў, што бацьку расстралялі. Сам Віктар разам з сястрой і маці прайшоў працоўны лагер.

«У кожнай карціне я спрабаваў паказаць «сваё» — што мне знаёма і дорага, што мной перажыта», — казаў рэжысёр. — Мне хацелася паказаць, як людзі мараць жыць у міры».

У другім ігравым фільме «Я родам з дзяцінства» сыгралі Уладзімір Высоцкі і Ніна Ургант. Першы разам з Марынай Уладзі быў частым госцем у доме Турава, як і рэжысёры Атар Іаселіяні і Вітаўтас Жалакявічус, кампазітар Яўген Дога (ён напісаў музыку к фільму «Чорны бусел») і іншыя сябры, што ўспаміналі Віктара Турава толькі цёплымі словамі. Напрыклад, Яўген Дога расказваў пра патрыятычнасць рэжысёра ці з якой трапятлівасцю той ставіўся да музыкі, якую лічыў паўнавартасным, раўназначным складнікам фільма.

Віктар Тураў казаў: «Рэжысура — гэта не прафесія, а склад мыслення. Як прафесіяй ёй лёгка авалодаць, штогод ствараюцца сотні карцін, але яны неяк сыходзяць... А тыя адзінкі, дзе мастакі *ствараюць*, разважаюць пра боль і праблемы людзей, застаюцца».

Ролю рэжысёра ў беларускім кіно параўноўваюць са значэннем Васіля Быкава для нашай літаратуры. У гісторыю аўтар упісаны карцінамі «Вайна пад стрэхамі», «Сыны ідуць у бой», «Час яе сыноў», «Пункт адліку», «Людзі на балоце» паводле Мележа. Экранізацыя «Шляхціча Завальні» 1994 года з Уладзімірам Гасцюхіным у галоўнай ролі стала апошнім фільмам рэжысёра і зноў пакінула беларускі кінематограф у крызісе.

Затое з «залатога перыяду» застаўся працаваць Міхаіл Пташук. Таксама вясковы хлопец, што атрымаў вышэйшую адукацыю ў Маскве (у Маскоўскім тэатральным вучылішчы імя Шчукіна), таксама патрыёт, які кожны дом у сваіх карцінах будаваў па адным узоры. Па тым, які добра ведаў.

Міхаіл Пташук казаў, што нацыянальнага кіно ў Беларусі ніколі не было, але сам ён зрабіў у яго (калі меркаваць, што яно ўсё ж такі існавала) немаленькі ўклад хаця б экранізацыямі нашай класікі — «Знак бяды» па Быкаву, «Чорны замак Альшанскі» па Караткевічу, «Вазьму твой боль» па Шамякіну.

Імёны Віктара Турава і Міхаіла Пташука закальцоўваюць «залаты перыяд» беларускага кіно, які прыпаў, умоўна кажучы, на дваццаціпяцігоддзе ў 1960-1980-я гады.

А першы свой фільм Пташук зняў у Маскве — «Пра Віцю, пра Машу і марскую пяхоту», у якім дэбютаваў тады яшчэ студэнт ГІЦІСа Аляксандр Абдулаў, «шэфствавалі» над здымачнай групай Слава Гаварухін і Кіра Муратава, а мастацкім кіраўніком (гэта была дыпломная работа Вышэйшых рэжысёрскіх курсаў Дзяржкіно СССР) згадзіўся стаць Георгій Данелія. З гэтага ўсё і пачалося, карціна прынесла аўтару ўсесаюзную славу.

«Пасля трыумфу мяне запрасілі ў Дзяржкіно і прапанавалі пераехаць у Мінск, — успамінаў Міхаіл Пташук у адным з інтэрв'ю. — У роднай сталіцы мяне сустрэў старшыня беларускага Дзяржкіно Мацвееў, і мы паехалі выбіраць для мяне прыдатную кватэру. Спыніўся на двухпакаёвай, хоць мог узяць і трохпакаёвую...»

Пасля яшчэ пары рэжысёрскіх прац Пташук стаў здымаць «для душы», сам Віктар Тураў у свой час называў яго сярод самых выдатных беларускіх аўтараў, што павінны падтрымліваць гонар беларускага кіно.

Між тым пачатак 1990-х, распад СССР стаў яшчэ адным пераломным момантам для беларускага кіно — цэнтралізаваная сістэма фінансавання кінематографа завісла ў паветры. Шмат каго ап'яніла «незалежнае» кіно — мецэнаты гатовы былі даваць грошы рэжысёрам. Праўда, часта гэта прадугледжвала пэўныя ўмовы, так што незалежнасць аказвалася несапраўднай. Міхаіл Пташук быў звольнены з нацыянальнай кінастудыі. «Пачаліся масавыя звальненні. Усіх запар: рэдактараў, аператараў, рэжысёраў. Аказаўся беспрацоўным і я. Трапіў пад скарачэнне. Прычым не адзін. Пацярпелі самыя лепшыя — лаўрэаты прэмій, гонар кінематографа Беларусі».

Пташук, напэўна, першым з беларускіх рэжысёраў зняў фільм за ўласныя грошы — без дзяржаўных і мецэнацкіх сродкаў. Проста ўзяў пазыку ў банку.

Пасля карціны «У жніўні 44-га» яго запрасілі працаваць у Галівудзе, ён нават зняў там карціну «Песня Розы» («У чэрвені 1941-га»).

Жыццё яго ішло паводле сапраўднай кіношнай драматургіі. Поспех, мастацтва (ён ніколі не гнаўся за грашыма), узнагароды, праца ў Галівудзе пераравіліся так раптоўна і незразумела. Калі Міхаіл Пташук ехаў у Маскву атрымліваць узнагароду «Ніка» за фільм «У жніўні 44-га», ён трапіў у аўтакатастрофу. Гэта быў 2002 год.

Год таму беларускія кінакрытыкі стварылі рэйтынг беларускіх фільмаў. У катэгорыях ігравога кіно аказалася пяць карцін Турава і дзве Пташука.

Залаты перыяд беларускага кінематографа, здаецца, застаўся ў мінулым, толькі любы канец для нечага становіцца пачаткам. Будуць яшчэ беларускія вуліцы называць у гонар нашых рэжысёраў.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ. *katsyalovich@zviazda.by*

■ Нотны радок

VIVACE ПА-ГОМЕЛЬСКУ

Упершыню горад праводзіць форум класічнай музыкі

Яго завуць Мурад Асуіл. Ён малады, таленавіты і актыўны: здолеў арганізаваць цэлы музычны фестываль у горадзе, дзе ніколі не было вялікіх імпрэз, прысвечаных класічнай музыцы. Яму ў гэтым дапамог Бетховен.

Музыка Бетховена напоўнена энергіяй, абуджае да змен і перагляду звычак. Гамяльчан дакладна: узімку гораду надала тонусу энергія твораў нямецкага класіка, народжанага 245 гадоў таму. Але некаторыя маглі адкрыць для сябе Бетховена, творчасць якога была прадстаўлена цягам пяці вечароў. Прадстаўлена кожнаму, хто не захацеў сядзець дома, хто імкнуўся далучыцца да аднаго з самых загадкавых мастацтваў. І была магчымасць зразумець: музыка — да ўсіх узростаў, пакаленняў, сацыяльных груп. Яе трэба проста адчуваць.

Гэта імкнуўся данесці аўтар ідэі форуму, лаўрэат міжнародных конкурсаў, які цяпер з'яўляецца галоўным дырыжорам Гомельскага сімфанічнага аркестра, Мурад Асуіл. Выхаванец беларускай музычнай школы, які мае мараканскія карані, настолькі наш, што гатовы ствараць культурны асяродак нават тады, калі сама ідэя можа некаторым здавацца дзіўнай. І настолькі сам напоўнены бетховенскім духам жыццясцвярджэння, што верыць: класіка заўсёды прывабіць людзей сваёй меладычнасцю і глыбінёй. А побач з асобай Бетховена ўзнікаюць яшчэ думкі пра тых, хто быў яго папярэднікам ці паслядоўнікам. Але Мурад Асуіл — яшчэ і патрыёт беларускай музыкі, яе выканальніцкай часткі. На першы форум класічнай музыкі ён запрасіў найлепшых выканаўцаў, якімі краіна можа ганарыцца. Як, напрыклад, народным артыстам Беларусі прафесарам Ігарам Алоўнікавым. Але ёсць і маладыя музыканты, якія адзначаны на міжнародных конкурсах, але з задавальненнем выступаюць у Гомелі, як скрыпач Алег Яцына ці віяланчэліст Міхаіл Рудунскі і іншыя. Каб паслухаць тэнара Яната Нялепу, трэба ехаць у Вялікі тэатр у Мінск. А тут ён браў удзел у адным з вакальных канцэртаў на форуме ў Гомелі, дарэчы, ужо разам з піяністам Мурадам Асуілам. Духавы квінтэт «Woodwind friends» пад кіраўніцтвам Максіма Расохі прадставіў праграму «Эпоха Бетховена», дзе класічныя творы прагучалі ў пералажэнні для гэтага калектыву. Культурныя месцы горада напоўніліся музыкай, яна прыйшла і ў Белую гасцёўню палаца Румянцавых і Паскевічаў, і нават у тэатральную залу. Пяць вечароў, пяць праграм, пяць сустрэч з таленавітай Беларуссю. І гэта толькі пачатак: форум класічнай музыкі хочуць зрабіць штогадовым і кожны раз прысвячаць творчасці выдатных музыкантаў. Варта пачаць — цікавасць прыходзіць...

Ларыса ЦІМОШЫК. *tsimoshyk@zviazda.by*

■ Імпрэза

КАЛІ ЛАСКА, ТОЛЬКІ ЖЫВІ!..

«Травіята» ў дапамогу оперным канкурсантам

Віялета яшчэ не памерла, але сэрца ўжо напаўняецца жалем. І музыка яшчэ ж такая журботная — адпаведна інтрыгам і драме. І ўвесь фінал конкурсу оперных выканаўцаў трымалася інтрыга: хто?..

Уладальніца гран-пры Надзея ПАЎЛАВА (Расія).

Расіянка Надзея Паўлава ў фінале II Мінскага опернага конкурсу разам з народным артыстам Беларусі Уладзімірам Пятровым спявала ўрывак з оперы Джузэпэ Вердзі «Травіята». Яе Віялета была трапяткой, пяшчотнай, рамантычнай асобай — ніяк не назавеш «дарагой утрыманкай». Прыстойная дзяўчына, якая апынулася ў складаных жыццёвых абставінах. Менавіта так гэта і адчула публіка, якая вельмі спачувала эфектнай прыгажуні ў той час, калі тая ў спевах высвятляла адносіны з Жэрмонам. Відаць, разыгранай драмай было ўражанае журы: Музыка Вердзі дапамагла Надзеі Паўлавай здабыць гран-пры Мінскага опернага конкурсу і 10000 долараў прэміяльных. Дапамог вопыт: за плячыма шмат конкурсаў, перамог і актыўная тэатральная праца. Выпускніца Петразаводскай дзяржаўнай кансерваторыі цяпер працуе ў Пермскім тэатры оперы і балета. Але партыю Віялеты спявала ў «Травіяце» Латвійскай нацыянальнай оперы, пастаўленай Андрэйсам Жагарсам, які вылучаецца інтэрпрэтацыямі опернай класікі.

У конкурсе было важна, каб спевакі паказалі сябе яшчэ і артыстамі, менавіта таму фінал стаў не проста канцэртам з нумароў, за вечар перад гледачамі прайшлі адразу некалькі міні-спектакляў: артысты выконвалі ўрыўкі з опер ў дуэце з беларускімі салістамі. І, можа быць, «сцены» дапамагалі нашаму тэнару Віктару Мендзелеву, якога адзначылі II прэміяй. Ён саступіў украінскаму тэнару Міхаілу Малафію, якому паводле рашэння журы прысуджана I прэмія ў Мінску. Але абодва тэнары атрымалі ў дадатак цікавыя прапановы наконт развіцця артыстычнай кар'еры. Украінскі спявак паедзе на конкурс вакалістаў у Францыю. Наш Віктар Мендзелеў запрошаны выступіць у тэатры «Лірыкарэогра 20» у канадскім Манрэале. У лік лаўрэатаў трапіла і сапрана Алена Сціхіна з Расіі — III прэмія за эфектна разыграную трагедыю «Тоскі».

Прыгожы фінал, цікавыя артысты. Прыгожая музыка класічных опер. Але... Калі оперны конкурс ладзіць наша краіна, то, можа быць, трэба было б прадставіць і оперную Беларусь — усё-такі ёсць наша музычная спадчына, творы беларускіх кампазітараў. Вядома, канкурсант выбірае тое, дзе ён найбольш выйгрышна выглядае. Але нейкі перадконкурсны «пралог», свайго роду ўверцюра з фрагментаў твора (-аў) каго-небудзь з беларускіх кампазітараў магла б дадаць нацыянальных фарбаў у фінальны канцэрт, тым самым дазволіўшы публіцы пераканацца ў тым, што сам конкурс у нашым тэатры ўзнік нездарма, для яго быў створаны падмурак гістарычным развіццём самога тэатра, і ёсць творчая глеба — існаванне беларускай музыкі, якая, між іншым, ствараецца і ў наш час, яна жыве! Але можа адчуць сябе жывой, калі запатрабаваная, гучыць, калі і яе выконвае сучаснае пакаленне артыстаў для цяперашніх гледачоў.

Таму што ўсё, што ні робіцца ў тэатры сёння, робіцца ў першую чаргу для айчыннай публікі. Ёй спадабаліся больш за іншых Надзея Паўлава і Міхаіл Малафій — упершыню глядацкі прыз у Мінску прысуджаны гэтым двум канкурсантам. Але конкурс — толькі нагода для знаёмства. Таму што далей маладыя галасы ўдзельнікаў можна будзе пачуць у спектаклях Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

Кнігі «па інтарэсах»

Маршруты беларускіх чытачоў

Я як цяпер памятаю маю першую беларускую кнігу. Гэта быў зборнік беларускіх народных казак «Бацькаў дар» з малюнкамі Анатоля Волкава. Я не ведаю, чаму зняла з паліцы менавіта яго (у бацькоўскім доме ёсць шмат беларускамоўнай літаратуры), але гэтае выданне здалося мне нейкім чароўным. Напэўна, з-за вокладкі, а можа, з-за назвы. Я не выбрала тады «Пакінутую на досвітку» Гаўрылкіна ці штосьці іншае — нічога не змяніць: мая першая беларуская кніга — «Бацькаў дар» на матчынай мове.

Але ў нашай краіне чамусьці першая беларуская кніга «здараецца» з многімі толькі ў школе, яе не запамінаюць, яе не будуць перачытваць. Беларускія кнігі мы чытаем часцей за ўсё быццам пад прымусам у рамках абавязковай школьнай праграмы, а для асалоды выбіраем замежныя. Чаму так здараецца? Што рабіць, каб беларуская літаратура для нас не станавілася чужой?

Можа быць, уся справа ў прасоўванні беларускай літаратуры, у тым, як кнігі павінны прыходзіць да чытача? Чаму творы Караткевіча і Шамякіна маглі папулярызаваць? Іх куплялі (як на рускай, так і на беларускай мове), бо было цікава чытаць такую літаратуру. Ці толькі ў адсутнасці правільнай рэкламы праблема? Можа, беларускі чытач проста не гатовы да нашай сучаснай літаратуры? Хто б што ні казаў, але ў нас ёсць і бібліятэкі, і кнігарні (прынамсі ў вялікіх гарадах, у правінцыі з кніжнымі крамамі складаней), і сайты, якія займаюцца распаўсюджваннем кніг. Літаратуру можна знайсці дзе заўгодна — ад букіністычных аддзелаў і паліц буккросінгу (абмену кнігамі) да «спатканняў з кнігай» — акцый, якія ладзяцца ў Мінску даволі часта. Знайсці кнігу, якая зацікавіла, сёння не праблема, было б жаданне.

Прыпынак «Бібліятэка»

Я чула, што ў савецкі час модна было прызначаць спатканні ў бібліятэках — настолькі яны былі папулярныя. Цяпер жа, кажуць, бібліятэкі паміраюць. Кажуць, што гэта проста сховішчы, апошні дом для кнігі. Магчыма, гэта праўда: наколькі часта мы цяпер ходзім у бібліятэкі?

Таіса Шынкевіч працуе ў сталічнай бібліятэцы імя А.С. Пушкіна. Здзіўляецца, калі я пытаюся ў яе пра сітуацыю з беларускай літаратурай:

— Не вельмі часта ў нас яе бяруць. А калі і бяруць, то Караткевіча, Быкава, Алексіевіч (не толькі цяпер, але і раней, зараз усё ўвогуле разабралі). Яшчэ з сучаснай літаратуры — Жывалеўскага... Але на беларускай у нас чытаюць мала.

Можа, у сталіцы чытач становіцца больш мабільным, яму няма калі хадзіць на абанемент і шукаць патрэбную кнігу? Але ў правінцыі бібліятэкі да гэтай пары з'яўляюцца ледзьве не адзінай сувяззю з літаратурным светам.

Напрыклад, у Паставах адзіная кнігарня знікла больш за 7 гадоў таму. Застаўся невялікі кніжны аддзел ва ўнівермагу, але асартымент там ніколі не змяняецца, а старыя кнігі ніхто не купляе. Для жыхароў горада адзіным выйсцем становіцца якраз бібліятэка — яе загадчык кажа, што чытаюць там сапраўды шмат — ад класікаў да нашага сучасніка празаіка Андрэя Федарэнкі. Не дзіва, што апошнім часам узрасла цікавасць да твораў Алексіевіч — былі выпадкі, калі людзі запісваліся ў бібліятэку знарок, каб узяць яе кнігі.

Нягледзячы на рознасць меркаванняў, што такое сучасная бібліятэка — кнігасховішча ці рэальная магчымасць знайсці жаданую кнігу, — яны існуюць і гатовыя працаваць з чытачамі. Былі б кнігі.

Прыпынак «Кніжная крама»

Калі звярнуцца да статыстыкі па выпуску беларускай літаратуры, якую я атрымала ў Міністэрстве інфармацыі, то можна даведацца, што за 9 месяцаў бягучага года ў Беларусі выдадзена 840 назваў кніг і брашур агульным накладам 2,57 млн экзэмпляраў (у параўнанні з мінулым годам — гэта на 1,6% больш па назвах). Удзельная вага беларускай кнігі за гэты перыяд па назвах — 11,4% ад агульнай колькасці, па накладу — 15,5%. Але тыраж выхаду беларускай літаратуры за апошнія 3 гады не змяняўся — ён застаецца на мяжы 2,6 мільёна экзэмпляраў.

Ці адлюстроўваюць гэта кнігарні? Дзяржаўныя, прыватныя, вядомыя і толькі што адчыненыя — іх безліч. Але і кнігарні не гарантуюць поспеху ў пошуках жаданага. З уласнага досведу: кнігу аднаго сучаснага беларускага аўтара я не знайшла ні ў адной з крам (абышла тады іх не менш за 5). Але ж наяўнасць кніг залежыць ад чытацкіх запытаў.

Марына Апёнак з кнігарні «Светач» кажа, што 80% беларускіх кніг, якія тут купляюць, — гэта падарункавыя выданні і альбомы, а на мастацкую літаратуру застаецца 15%. Але асабліва можна вылучыць гістарычны кірунак, на які прыпадае 5%: добра разыходзяцца кнігі Анатоля Бутэвіча, Міколы Ермаловіча, Людмілы Рублеўскай, Віктара Праўздіна.

— У нашай краме шмат пакупнікоў беларускіх кніг, асабліва моладзі ў апошні час. І кніг вельмі шмат на беларускай мове, у тым ліку і дзіцячых. А для моладзі ёсць серыя «Мая беларуская кніга» — яна вельмі паспяховая, бо і кошты дэмакратычныя, і ўсю класіку перачытаць можна. Напэўна, моладзь пачынаюць выхоўваць у духу любові да сваёй радзімы, — мне здаецца, гэта сапраўды так, інакш патлумачыць іх цікаўнасць да беларускай літаратуры не магу. Людзі цяпер любяць чытаць на беларускай мове, у нас пераклады амаль не купляюць — толькі на беларускай! Можа, таму што беларускае рэкламуем — праводзім сустрэчы з пісьменнікамі, — да нас прыходзілі Бутэвіч, Шніп, Гальпяровіч, — кажа Алена Тарасюк, загадчыца крамы «Белкніга», што на праспекце Незалежнасці ў сталіцы.

Беларускія кнігі мы чытаем часцей за ўсё быццам пад прымусам у рамках абавязковай школьнай праграмы, а для асалоды выбіраем замежныя. Чаму так здараецца?

Ёсць погляд, што на беларускай літаратуры зарабіць немагчыма. Таму ў кнігарнях выбар сучаснага беларускага не такі разнастайны, ды і класіка ёсць не паўсюль. Але ёсць месца, дзе прадстаўлены амаль усе навінкі сучаснай беларускай літаратуры — гэта кнігарня «Ў». Юлія Бондар, прадавец крамы, кажа, што ў беларускай літаратуры ёсць усе шанцы, каб стаць папулярнай:

— Можна вешаць на білбордах цікавыя цытаты, уводзіць у школьную праграму цікавыя творы, паказваць маладым, што ў нас ёсць незвычайная літаратура. Варта імкнуцца любіць і паважаць сваё, уводзіць людзей у беларускамоўнае асяроддзе.

Аднойчы, я ўпэўнена, прыйдзе час, калі за беларускай будуць ганяцца, як у кнізе «Мова». Пра мову будуць дбаць, на мове захочуць гаварыць, на мове пажадаюць чытаць... Але пакуль чым можна патлумачыць, што на кніжным кірмашы на Нямізе няма беларускіх кніг? Хочаш 100 рэцэптаў страў з морквы — калі ласка, хочаш новую кнігу Вудзі Аллена — трымай, але ніводнай кнігі на беларускай мове не знайсці. Шукаем далей...

Букіністычныя аддзелы заўсёды здаваліся мне таямнічымі — у кожнай кнігі тут свая гісторыя: чаму яе здалі, хто яе прынёс? Магчыма, пераацэнка каштоўнасцяў, магчыма, хочуць падзарабіць.

— Часам на вокладках можна знайсці аўтограф самога Караткевіча, але іх купляюць імгненна, — кажа загадчыца букіністычнага аддзела ў кніжным доме «Веды» Галіна Сямёнаўна.

Прыпынак «Інтэрнэт»

У час інтэрнэту мы ўжо лянуемся выходзіць з кватэр па некалькі сотняў друкаваных аркушаў, мы хочам, каб іх да нас прывозілі, як гэта робіць, напрыклад, OZ.BY.

Але тут беларуская літаратура не карыстаецца асаблівай папулярнасцю:

— Верагодна, адбіваецца недахоп рэкламы. Прыклад таму — кніга «50 адценняў шэрага», якая за кошт рэкламы шмат месяцаў была лідарам продажу. Але і ў беларускай літаратуры ёсць шмат добых твораў, таму мы гатовыя прадаваць беларускую літаратуру нават з нізкай рэнтабельнасцю, каб падтрымліваць культуру нашай краіны, — тлумачыць PR-менеджар OZ.BY Валерыя Мельнікава.

«Чытач» — канцавы прыпынак

Чытачоў беларускай літаратуры, можа, не шмат, але яны ёсць. І гэта людзі, якія адразу скіраваныя на нешта пэўнае, гэта людзі сучасныя, інтэлектуалы. Можна іх умоўна падзяліць на групы, як той казаў, «па інтарэсах».

Ёсць людзі, якія цікавяцца сваёй краінай, тым, што тут адбываецца — гэта так званыя чытачы-інтэлектуалы, носьбіты культурнага менталітэту, у якіх спецыфічныя запатрабаванні — яны шукаюць, напрыклад, кнігі Бахарэвіча.

Ёсць тыя, хто любіць «жыццёвую» літаратуру, каго цікавіць не столькі закручаная кампазіцыя твора, колькі паводзіны героя ў абставінах, блізкіх чытачу — мы ж заўсёды шукаем у кнігах сябе. Адсюль і прага «бытавой» прозы Батраковай і Лісіцкай.

А ёсць асобная частка грамадства — дзеці, а калі дакладней, то іх бацькі, якія арыентуюць дзяцей паважаць сваю краіну, любіць родную мову. Хутчэй за ўсё, яны будуць купляць «Сумны суп» Вольгі Гапеевай.

У пошуках дзіцячай літаратуры беларускага чытача заўсёды напаткае поспех — дзіцячае ў нас купляюць і любяць, адсюль і разнастайнасць выбару. За дзіцячай літаратурай, напрыклад, дакладна можна ісці ў «Кніжную шафу» — уладальнікі ўжо ведаюць, што кнігі для самых маленькіх карыстаюцца попытам, таму і выданняў тут хапае:

— Прыходзяць мамы і таты, якія прывучаюць дзяцей да беларускай мовы. Жывыя, з бліскучымі вачыма. Такіх людзей адразу пазнаеш. Аднойчы прыходзіла жанчына, якая шукала кнігі для ўнукаў, якія жывуць у Амерыцы. Іх бацька хацеў навучыць дзяцей менавіта беларускай мове, — распавядае ўладальніца «Кніжнай шафы» Настасся.

Але і з дзіцячымі беларускімі кнігамі ў крамах часам бываюць праблемы — іх не хапае! Здаецца, калі гэтыя кнігі карыстаюцца папулярнасцю, то чаму нашы пісьменнікі і выдаўцы не робяць высноў для сябе? Адказу няма, але ёсць факт: беларусы гатовыя купляць дзецям любую літаратуру на роднай мове — у тым ліку перакладную замежную, напрыклад вершы Пушкіна па-беларуску.

Напэўна, апошнія і вызначаюць будучыню беларускай кнігі, калі выхоўваюць на ёй дзяцей. Малыя запомняць сваю першую кнігу, такое чытанне стане для іх натуральным. Беларускім сучасным пісьменнікам трэба пра іх падумаць: што заўтра захочуць чытаць тыя, хто вырас на беларускамоўных кніжках? Ці хопіць ім толькі таго, што ўжо напісана? А галоўнае — калі гэтыя дзеці, выгадаваныя на родным слове, стануць прасіць больш і больш беларускага, можна будзе адразу сказаць, што наша літаратура — it's a new black (гэта крута)!

Маргарыта ДЗЯХЦЯР.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЙ

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	Право заключения договора аренды помещения, площадью 76,9 кв.м в здании бывшего кондитерского цеха (капитальное строение, инв. № 410/С-22266), расположенного по адресу: г.п. Россь, ул. Матросова, 2, сроком 2 года с даты заключения договора аренды
Начальная цена продажи	2 307 000 (два миллиона триста семь тысяч) белорусских рублей с учетом НДС
Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды	- коэффициент 3,0
Сумма задатка	230 700 (двести тридцать тысяч семьсот) белорусских рублей
Условия аукциона	Для организации розничной торговли продовольственной и промышленной группами товаров
ЛОТ 2	
Наименование объекта, краткая характеристика	Право заключения договора аренды помещения, площадью 79,0 кв.м в здании жилищно-эксплуатационной службы (капитальное строение, инв. № 410/С-24221), расположенного по адресу: п. Красносельский, ул. Строителей, 8А, сроком 3 года с даты заключения договора аренды
Начальная цена продажи	2 370 000 (два миллиона триста семьдесят тысяч) белорусских рублей с учетом НДС
Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды	- коэффициент 3,0
Сумма задатка	237 000 (двести тридцать семь тысяч) белорусских рублей
Условия аукциона	Для организации розничной торговли непродовольственной группой товаров
Продавец	Производственное коммунальное унитарное предприятие «Волковысское коммунальное хозяйство»
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора аренды	Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.
Аукцион состоится 19 января 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3	

Аукцион проводится в соответствии с Инструкцией о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в собственности Волковысского района, утвержденной Решением Волковысского районного Совета депутатов 19.12.2003 № 36.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 14 января 2016 г. до 15.00

Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-43801 (назначение – дом рыбака, наименование – дом рыбака), площадью 378,3 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Поречский с/с, д. Новая Руда. Составные части и принадлежности: сети электроснабжения, канализационная сеть
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422087507601000115 (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания дома рыбака), площадью 0,1500, расположенном по адресу: Гродненский р-н, Поречский с/с, д. Новая Руда. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,1500 га
